Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 ЖНІЎНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 146
(26504)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр Лукашэнка адзначае станоўчую дынаміку ў зніжэнні колькасці злачынстваў у Беларусі

Апошнія гады ў Беларусі назіраецца станоўчая дынаміка ў зніжэнні колькасці злачынстваў. Гэта адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях дзейнасці органаў пракуратуры.

Так, у першым паўгоддзі 2009 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года зарэгістравана на 9,5 працэнта менш злачынстваў, на 8,5 працэнта скарацілася колькасць асабліва цяжкіх, на 12 працэнтаў — цяжкіх злачынстваў, на 24 працэнты — наўмысных забойстваў. Адзначаецца істотнае зніжэнне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, разбояў, рабаванняў, хуліганстваў.

У той жа час сур'ёзную заклапочанасць выклікае раскрывальнасць злачынстваў, падкрэсліў Прэзідэнт. Амаль 42 працэнты ўчыненых у першым паўгоддзі злачынстваў засталіся нераскрытымі, у тым ліку больш як 24 працэнты цяжкіх і асабліва цяжкіх. Значнай з'яўляецца і рэцыдыўная злачыннасць, назіраецца рост крадзяжоў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, хабарніцтва, службовыя падлогі.

Прэзідэнт лічыць, што наяўнасць у гэтай сферы істотных і сістэмных недахопаў з'яўляецца непрымальным і проста недапушчальным. І калі такія недахопы ёсць, то іх трэба аператыўна ўстараняць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што было прынята рашэнне аб правядзенні комплекснай праверкі органаў пракуратуры, каб выпрацаваць меры для павышэння эфектыўнасці іх дзейнасці. Аляксандр Лукашэнка заклікаў усіх прысутных да адкрытага абмеркавання ўсіх актуальных пытанняў, якія датычацца органаў пракуратуры, а таксама выказваць канструктыўныя прапановы па вырашэнні існуючых праблем.

У Беларусі няма крымінальнага бязмежжа, масавых праяўленняў экстрэмізму і антыканстытуцыйных дзеянняў, нягледзячы на пэўныя цяжкасці ў станаўленні і развіцці беларускай дзяржаўнасці. Гэты факт асабліва падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ад якасці выканання пракуратурай сваіх функцый у многім залежаць законнасць і правапарадак у грамадстве, аўтарытэт улады, устойлівае і эфектыўнае развіццё дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што тая роля, якую пракуратура адыгрывае ў жыцці грамадства і дзяржавы, была і застаецца нязменнай: стаяць на варце закона і прававых асноў дзяржавы. Ён нагадаў, што ў краіне ніколі не сумняваліся ў неабходнасці існавання пракуратуры як такой, не ставілася пытанне аб абмежаванні яе наглядных паўнамоцтваў. Менавіта на пракуратуру ўскладзены такія адказныя функцыі, як нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем законаў, барацьба са злачыннасцю і карупцыяй, абарона правоў і свабодаў грамадзян, інтарэсаў дзяржавы. «Фактычна, можна гаварыць, што пракуратуры паднаглядныя ўсе сферы грамадскага жыцця і дзяржаўнага кіравання», — сказаў ён. У той жа час Аляксандр Лукашэнка заявіў, што органы пракуратуры не павінны быць адасобленай структурай у дзяржаве, нейкай кастай, а павінны служыць дзяржаве і беларускаму народу. Да кантралюючых структур у дзяржаве прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні. «Таму што вам дадзена права кантраляваць, а кантралёр павінен быць сам на парадак вышэйшы ў сваёй маралі і ў свядомасці тых, каго ён кантралюе», — падкрэсліў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што пакуль пракуратура не ва ўсім адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца жыццём. Пра гэта сведчаць як факты, так і грамадская думка. «Дзейнічайце ў інтарэсах дзяржавы — вось што мне перш за ўсё патрэбна ад пракуратуры», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адказнасць за карупцыю павінна быць максімальнай. «Шкадаваць тут нікога не трэба. Бо чыноўнік пастаўлены абараняць інтарэсы людзей, а атрымліваецца, што ён яшчэ і апошнія грошы з чалавека выбівае», — сказаў Прэзідэнт.

«Не колькасцю — уменнем трэба браць. Для мяне важныя паказчыкі эфектыўнасці. У эканоміцы — гэта прыбытак і рэнтабельнасць. Вось, напрыклад, нядаўна выпусцілі пастанову № 991 «Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» і фактычна забаранілі суб'ектам гаспадарання гандляваць. Ды няхай кіраўнік сам вырашае, як дзейнічаць, а спытваць трэба за прыбытак і рэнтабельнасць! Навошта камусьці ўказваць: з кім гандляваць, працаваць з пасрэднікамі ці не? Пачалі разбірацца, хто пастанову рыхтаваў. Высветлілася, адзін «дзеяч» па ўказцы прэм'ер-міністра падрыхтаваў гэты дакумент, кінуў яму на стол і назаўтра паехаў у водпуск. Спытаць нават няма з каго! Так, пасрэдніцтва — гэта дрэнна, і мы павінны яго пазбягаць. Але з якой мэтай? Каб цана была ніжэйшая, а якасць — лепшая. Навошта ўздыбілі ўсю краіну? Гэта справа прыватніка, дзе і як купляць, ён жа разумее, што гэта яго грошы, ён ніколі не купіць даражэй і з горшай якасцю. Значыць, пытанні да дзяржаўных прадпрыемстваў. Дык давайце паставім задачы, а потым — праз месяц праверым, вінаватыя адкажуць. Вось і ўсё, не трэба ніякага шуму. Інакш узнікаюць пытанні: дзе ж тая лібералізацыя эканамічнай дзейнасці, пра якую мы гаворым, дзе самастойнасць кіраўніка, калі мы яму пішам, што ў каго купіць. Нехай ён сам разбіраецца, а наша задача даць прававую і іншую ацэнку кіраўніку, які адказвае за прадпрыемства. Вось як трэба дзейнічаць, а не фронтам хадзіць па краіне», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз выказаў сваё жорсткае патрабаванне — выключыць неабгрунтаваныя праверкі: «Гэта датычыцца ўсіх кантралюючых і наглядных органаў — не павінна быць неабгрунтаваных і самавольных праверак. Не трэба адцягваць людзей ад працы, не перашкаджайце кіраўнікам прадпрыемстваў і проста бізнэсу ў гэты сур'ёзны час. Прыходзьце ў арганізацыі і да прадпрымальнікаў толькі ў тым выпадку, калі пракананыя, што правапарушэнне мае месца. Калі хтосьці грэбуе законам — прыцягвайце да адказнасці. Але ісці з праверкамі трэба толькі туды, дзе ёсць за што зачапіцца, ніякіх «авось за што-небудзь зачэпімся» быць не павінна. Інакш узнікае падазрэнне: чаго туды пайшоў, можа, з кім-небудзь рахункі звесці? Або дапамагчы камусьці з канкурэнтам змагацца? Або вышукваеце, што ў кішэню пакласці?». Аляксандр Лукашэнка пры гэтым дадаў: «Калі ў прадпрыемства добры прыбытак і рэнтабельнасць, туды з праверкамі ўвогуле хадзіць не трэба. Інакш гэта падразае ініцыятыву людзей. Калі ісці — то толькі за вопытам».

У заключэнне Прэзідэнт зноў заявіў: «Скажу адкрыта: мяне не задавальняе стан работы пракуратуры па прадухіленні і спыненні карупцыйных праяў. Ды і пра якую барацьбу з карупцыяй можна весці гаворку, калі самі пракурорскія работнікі грашаць гэтым: атрыманнем хабару, лабіраваннем інтарэсаў камерцыйных структур, злоўжываннем службовымі паўнамоцтвамі». Ён таксама дадаў, што яго пазіцыя па гэтай праблеме застаецца нязменнай: ніхто не можа і не павінен сысці ад пакарання за падобныя дзеянні.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта, Дзяржсакратарыяту Савета Бяспекі і пракуратуры ў трохмесячны тэрмін перагледзець сістэму органаў пракуратуры з мэтай аптымізацыі і з улікам усіх заўваг, што прагучалі на нарадзе.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ГРЫБНАЯ ПЕЧ НЕ АСТЫВАЕ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Іосіф НЕСВЯТАЕЎ з вёскі Нарач Мядзельскага раёна ніколі не губляе магчымасць пасушыць баравікі ў напаленай печы. І ў яго гэта надзіва добра атрымліваецца. Цяпер у нарачанскім краі зноў пайшлі добрыя грыбы, і старая бацькоўская печ не паспявае астыць.

ПЕРАЛІК ТАВАРАЎ ДЛЯ ЛЬГОТНАГА СПАЖЫВЕЦКАГА КРЭДЫТАВАННЯ ЗАЦВЕРДЖАНЫ Ў БЕЛАРУСІ

Урад Беларусі зацвердзіў пералік тавараў, для набыцця якіх малазабяспечаным грамадзянам прадастаўляюцца льготныя крэдыты. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1010, паведамілі ў Апараце Саўміна. Дакумент прыняты ў мэтах рэалізацыі ўказа № 371 «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні» ад 6 ліпеня 2009 года.

Пералік тавараў, пры куплі якіх малазабяспечаныя грамадзяне змогуць карыстацца льготнымі крэдытамі, уключае шырокі асартымент прадукцыі айчыннай вытворчасці. У прыватнасці, гэта бытавая тэхніка: тэлевізары, DVD-прайгравальнікі вытворчасці ААТ «Гарызонт» і РУВП «Віцязь», пыласосы і мікрахвалевыя печы («Гарызонт», СТАА «Мідэа-Гарызонт», «Віцязь»), маніторы (НВА «Інтэграл» і «Гарызонт»), халадзільнікі і маразільнікі (ЗАТ «Атлант»), электра- і газавыя пліты (адкрытыя акцыянерныя таварыствы СП «Брэстгазаапарат», «Брэсцкі радыётэхнічны завод», «Электраапаратура» (Гомель), РУП «Гомельскі радыёзавод імя 60-годдзя СССР»). Па льготным крэдыце можна набыць таксама пральныя машыны (ЗАТ «Атлант», ААТ «Мінскі завод «Тэрмапласт», РУП «Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С.М. Кірава»), кухонныя машыны (адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Мінскі завод «Тэрмапласт», «Мінскі прыборабудаўнічы завод», «Гандальмаш» (г.Баранавічы), «Экран» (г.Барысаў). У пералік уключаны таксама ацяпляльныя катлы і электраводанагравальнікі беларускай вытворчасці.

Ільготнае крэдытаванне прадугледжана і пры рэалізацыі дываноў і дывановых вырабаў, якія выпускаюцца адкрытымі акцыянернымі таварыствамі «Віцебскія дываны» і «Дываны Брэста», а таксама мэблі айчыннай вытворчасці, дрэваапрацоўчых станкоў.

Акрамя таго, малазабяспечаныя грамадзяне змогуць карыстацца льготнымі крэдытамі пры куплі тэхнікі: міні-трактароў вытворчасці Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў і Смаргонскага агрэгатнага завода, мапедаў і матацыклаў (ААТ «Мотавела»), мотаблокаў (РУП «Смаргонскі агрэгатны завод»), прычэпаў (ТАА «Завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «Маз-Купава», ААТ «Бабруйскагрэмаш», ААТ «Бабруйскселькмаш», ААТ «Спецаўтатэхніка» (г. Бабруйск), РУП «Смаргонскі агрэгатны завод», РУВП «Беларускі аўтамабільны завод»).

У адпаведнасці з указам № 371 «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні» малазабяспечаным грамадзянам у Беларусі ў 2009—2010 гадах будуць прадастаўляцца крэдыты тэрмінам да трох гадоў з выплатай 10 працэнтаў гадавых на спажывецкія патрэбы для набыцця нехарчовых груп тавараў працяглага выкарыстання. Функцыі па выдачы такіх крэдытаў ускладаюцца на Беларусбанк, Белаграпрамбанк, Белінвестбанк і Белпрамбудбанк. Права на атрыманне льготных спажывецкіх крэдытаў будуць мець грамадзяне, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і, вылічаны за тры месяцы, якія папярэднічалі месяцу заключэння крэдытнага дагавора, не перасягае трохразовага сярэднямесячнага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек (цяпер Br1163,8 тыс.).

БЕЛТА.

«МАЛЕНЬКАЯ ТРАГЕДЫЯ» БАТЭ

Нягледзячы на тое, што чэмпіён Беларусі барысаўскі БАТЭ свой хатні матч супраць латвійскага «Вентспілса» выйграў (2:1), Лігу чэмпіёнаў сёлета наш клуб пакідае на стадыі трэцяга кваліфікацыйнага раўнда. Прайгрыш у першым матчы латвійскаму клубу (0:1) разам з вынікам у Барысаве пазбавіў балельшчыкаў леташніх лігачэмпіёнскіх хваляванняў.

На барысаўскім стадыёне падапечных Віктара Ганчарэнкі згулялі ў той манеры, да якой паспелі мы прызвычаіцца ў мінулым сезоне, — з жаданнем і характарам. Але прапусціўшы мяч ад гасцей у першым тайме, адквітаць тры так і не здолелі. Сяргей Крывец двойчы паразіў вароты латвійскага клуба, трэці ж мяч, які і дазваляў праходзіць далей, у вароты не ішоў. Пасля фінальнага свістка футбалісты «Вентспілса» кідаліся на газон і віншавалі адзін аднаго, але стадыён скандіраваў «Малайцы!» менавіта беларускім гульцам, якія разгублена стаялі на газоне.

Барысаў падтрымаў свой клуб належна — ад жоўта-блакітнай атрыбутыкі, якая была ледзь не на кожным другім балельшчыку, да рачовак, якія разам з газетай Клуба балельшчыкаў атрымалі ўсе ахвотныя. Сяргей Крывец, які, дарэчы, пакідаў газон барысаўскага стадыёна апошнім пад апладысменты балельшчыкаў, пасля гульні падзякаваў заўзятараў БАТЭ і прызнаўся, што такі вынік стаў маленькай трагедыяй для кожнага ў камандзе: «Разумею, што гэта вельмі непрыемна для балельшчыкаў, якія нас падтрымлівалі. І ад імя каманды хачу сказаць, што мы перажываем, падаўленыя і расстроеныя нават больш, чым нашы прыхільнікі».

Фота Пятра ФАМІНА.

«Пасля мінулагодняга выступлення выраслі балельшчыкія чаканні, ад нас чакаюць поспеху. Тым не менш, у нас ёсць яшчэ адзін шлях, які хочацца максімальна падоўжыць», — заявіў Віктар Ганчарэнка.

Нагадаем, што цяпер барысаўскі клуб працягне выступленне ў Лізе Еўропы (былым Кубку УЕФА). Супернік нашай каманды вызначыцца сёння падчас жараб'ёўкі ў штаб-кватэры УЕФА.

Алена АЎЧЫННІКАВА.
г. Барысаў.

УМОВЫ ВЯДЗЕННЯ ІНВЕСТЫЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ ПАЛЯГЧАЮЦЦА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 6 жніўня выдаў Дэкрэт № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Дакументам устанаўліваюцца як для беларускіх, так і для замежных інвестараў правілы, якія аблягчаюць пачатак рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у Рэспубліцы Беларусь. Замацоўваецца таксама адказнасць інвестараў за выкананне ўзятых на сябе абавязацельстваў.

У дагаворах, што заключаюцца з інвестарамі, павінны быць дакладна вызначаны аб'екты, аб'ёмы і тэрміны ўкладання інвестыцый, а таксама адказнасць за іх невыкананне. Агаворваюцца таксама агульныя прэферэнцыі для праектаў, што рэалізуюцца ў рамках інвестыцыйных дагавораў.

Акрамя таго, уводзіцца трохузроўневая сістэма заключэння інвестарамі інвестыцыйных дагавораў з Рэспублікай Беларусь, дыферэнцыраваная ў залежнасці ад значнасці праекта і прэферэнцый, якія прадастаўляюцца.

Інвестыцыйны дагавор можа заключацца на падставе рашэння:

Савета Міністраў, узгодненага з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, калі дагаворам прадугледжваецца прадастаўленне інвестару прэферэнцый, не ўстаноўленых заканадаўчымі актамі або іншымі рашэннямі кіраўніка дзяржавы;

Савета Міністраў у выпадку, калі інвестыцыйным дагаворам прадугледжваецца прадастаўленне інвестару льгот і прэферэнцый, ужо ўстаноўленых заканадаўчымі актамі і іншымі рашэннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, іншай дзяржаўнай арганізацыі, якая падпарадкаваная Ураду, аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама ў выпадках, калі для рэалізацыі праекта прэферэнцыі не патрабуюцца.

Дэкрэтам замацаваныя абавязковыя ўмовы заключэння інвестыцыйных дагавораў, а таксама даецца магчымасць іх пашырэння зыходзячы з галіновай накіраванасці і спецыфікі інвестыцыйнага праекта.

З улікам практыкі рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у Рэспубліцы Беларусь інвестарам, якія заключылі інвестыцыйныя дагаворы, прапануюцца такія агульныя прэферэнцыі, як прадастаўленне зямельнага ўчастка ў арэнду без правядзення аўкцыёну; паэтапнае афармленне неабходных дакументаў па адводу зямельнага ўчастка адначасова з будаўніцтвам на фактычна занятых землях і будаўніцтва аб'ектаў з паралельным праектаваннем наступных этапаў будаўніцтва; увоз тэхналагічнага абсталявання і запасных частак да яго для аб'ектаў, звязаных з рэалізацыяй інвестыцыйнага праекта, без платы мытных пошлін і падатку на дабаўленую вартасць.

Акрамя таго, інвестар вызваляецца ад пакрыцця страт сельскагаспадарчага прадпрыемства, а таксама кампенсацыйных выплат, звязаных з пераносам і высечкай зялёных насаджэнняў на землях населеных пунктаў; платы дзяржаўнай пошліны за выдачу спецыяльных дазволаў замежным грамадзянам, якія прыцягваюцца інвестарам для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, на занятак працоўнай дзейнасцю ў нашай краіне, а ўказаныя замежныя грамадзяне — ад платы дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволаў на часовае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь.

Разам з тым у Дэкрэце прадугледжана, што ў выпадку невыканання (або неналежнага выканання) інвестарам узятых на сябе абавязацельстваў Рэспубліка Беларусь у аднабаковым парадку можа адмовіцца ад выканання сваіх абавязацельстваў па заключаным інвестыцыйным дагаворы.

Гэтыя нормы накіраваныя на стымуляванне шырокамаштабнай інвестыцыйнай актыўнасці.

Дэкрэт уступае ў сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем некаторых пунктаў, з'яўляецца часовым і прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу. Дзеянне Дэкрэта не распаўсюджваецца на інвестыцыйныя дагаворы, заключаныя да ўступлення ў сілу гэтага Дэкрэта.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Несвижский райагросервис», КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже складского комплекса, расположенного по адресу: *Минская область, Несвижский район, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 23А,* в составе: зданий складов №№ 1, 2, 3, 4, 5 (об. пл. 847,8 кв.м; 1230,5 кв.м; 848,5 кв.м; 847,7 кв.м, 1158,2 кв.м), здания проходной, об. пл. 14,6 кв.м; административного здания, об. пл. 361,5 кв.м; бытового помещения, об. пл. 135,5 кв.м; сборочного цеха, об. пл. 1099,1 кв.м. Начальная цена с НДС – 2 012 254 000 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформированы земельные участки об. пл. 1,2299 га; 0,4298 га; 1,0950 га; 0,3800 га; 0,2267 га; 1,8757 га. Объекты продаются без условий. Задаток в сумме 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 20 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в следующем порядке: 50 % стоимости объекта оплачивается в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшиеся 50 % в течение четырех месяцев с даты первой оплаты. Возможна корректировка сроков оплаты по соглашению сторон до подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **10.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛІТВЕ ЯШЧЭ ПЯЦЬ ЧАЛАВЕК ЗАРАЗІЛІСЯ ГРЫПАМ A/H1N1

Яшчэ пяць новых выпадкаў заражэння вірусам A/H1N1 пацверджаныя ў сераду ў вірусалагічнай лабараторыі літоўскага Цэнтра Сніду. Пра гэта ў чацвер паведаміла міністэрства аховы здароўя Літвы. Усяго ў краіне зафіксаваныя 29 выпадкаў заражэння.

Як гаворыцца ў паведамленні, трое грамадзян, у якіх выяўлены гэты грып, пабывалі за мяжой. Захварэлі жыхары Каўнаскага, Вільнюскага, Укмергскага, Уцянскага раёнаў. Гэты вірус быў выяўлены і ў грамадзяніна Ізраіля, які часова знаходзіцца ў Літве.

Па стане на сераду, у Эстоніі зафіксаваныя 44 выпадкі заражэння, у Латвіі — 19. У цэлым у Еўропе зарэгістравана 28 908 чалавек, якія заразіліся грыпам A/H1N1, з іх 42 ужо памерлі.

НІКАЛЯ САРКАЗІ АТРЫМАЎ НОВЫ ЛІСТ З ПАГРОЗАМІ

Прэзідэнту Францыі Нікаля Сарказі даслалі чарговы ананімны ліст з пагрозамі, паведамляе AFP.

Ананімнае пасланне было адпраўлена з Без'е. Супрацоўнікі паштоватага аддзялення перахапілі яго пры сартаванні допісу. У ліст быў укладзены патрон для буйнакалібернай паляўнічай зброі. Тэкст, паводле звестак супрацоўнікаў антытэрарыстычнага ведамства, паказвае на тое, што аўтарамі паслання былі тыя ж асобы, якія адправілі папярэднія падобныя лісты. Паводле інфармацыі французскіх СМІ, пасланне пачынаецца са слоў «Мы не забыліся» і папярэджвае аб «няшчасных выпадках», якія могуць адбыцца з самім французскім прэзідэнтам і іншымі палітыкамі, у прыватнасці, Франсуа Лефеўрам і Фрэдэрыкам Мітэранам.

У тэксце паслання таксама сказана, што «кароль і яго клан будуць сцёртыя з зямлі». Таксама згадваецца «сын караля» — паводле меркавання следчых, аўтары паслання маюць на ўвазе сына прэзідэнта Жана Сарказі. Пад тэкстам стаіць подпіс «ячэйка 34». Тая ж групоўка падпісалася пад папярэднімі пасланнямі Сарказі. Акрамя таго, у лісце гаворыцца, што аўтары валодаюць «вельмі цікавымі» фатаграфіямі членаў сем'яў вядомых палітыкаў і пагражаюць хуткім часам распаўсюдзіць гэтыя здымкі.

У ІРАКУ ШЛЮБЫ ПАМІЖ СУНІТАМІ І ШЫІТАМІ ЗААХВОЧВАЮЦЬ ПРЭМІЯЙ У ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ДОЛАРАЎ

Урад Ірака заахвочвае грашыма каханне паміж прадстаўнікамі розных мусульманскіх канфесій — сунітамі і шыітамі. Маладыя з розных галін ісламу, якія рашылі стварыць сям'ю, атрымліваюць у падарунак дзве тысячы долараў. Гэтым правам скарысталіся ўжо больш за 1700 пар, паведамляе Associated Press.

У разгар гвалту ў Іраку колькасць змяшаных шлюбаў рэзка знізілася, аднак цяпер яны зноў атрымліваюць распаўсюджанне. Варожасць паміж рэлігійнымі групамі, якая прыводзіць да крывавых сутыкненняў, паступова слабее. За апошні час урад арганізаваў 15 масавых міжканфесійных вяселляў па ўсёй краіне.

Супрацьстаянне шыітаў і сунітаў пачалося з-за спрэчкі аб спадчынніках Прарока Мухамеда. Суніты не прызнаюць магчымасці пасрэдніцтва паміж Богам і людзьмі пасля смерці Мухамеда. Шыіты ж лічаць законнымі пераемнікамі Прарока нашчадкаў Алі, зяця і стрыечнага брата Мухамеда. Да вайны ў Іраку суніты і шыіты часта ствараліся сем'і: тады рэлігійная прыналежнасць значыла менш, чым стаўленне да рэжыму Садама Хусейна. Аднак затым радыкалы рэзка актывізаваліся, людзі з-за страху практычна перасталі ствараць змяшаныя сем'і.

Урадавая дапамога маладым вельмі да месца — у краіне кожны чацвёрты жыве за рысай беднаты на 2,5 долара ў дзень. Каб атрымаць грошы, дастаткова напісаць заяву ў адміністрацыю віцэ-прэзідэнта, падаўшы дакументы аб шлюбе. У дзень урачыстай цырымоніі ўлады перадаюць мужу канверт з грашыма.

КАЛІ Ж ДЗЯЦЕЙ ХТО-НЕБУДЗЬ ПАЛЮБІЦЬ?

Вельмі асабістае

Даўным-даўно, калі я пачынала займацца тэмай сіроцтва, давялося ў складзе адной «дэлегацыі» бываць у чарговым дзіцячым доме. Сталічныя госці прывезлі тады дзецям з глыбінкі шмат падарункаў — цацак, прысмакаў... Памятаю, гэта былі дзеці гадоў пяці-шасці. Не паспявалі малыя атрымліваць грунтоўныя «ўпакоўкі», як тут жа таропка разгортвалі «сакрэтныя» скруткі. І толькі адна дзяўчынка сціпла паклала падарунак на каленкі і працягвала сачыць за тым, што адбывалася навокал. ЯНА НІ РАЗУ НЕ ЎСМІХНУЛАСЯ.

Я асцярожна падумала: няўжо не існуе таго, што здольна парадаваць сур'ёзнае бялявае дзяўчо? Гэта быў першы і да сёння апошні раз у жыцці, калі мне захацелася абняць, прытуліць, вылезці са скуры ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ. Я папрасіла фотакарэспандэнта «шчоўкнуць» для мяне дзяўчынку...

Мая маці паглядзела на адбітак і сказала: «Яна так падобная на цябе...». І мы заплакалі. Над сваім жалем да чужога лёсу, над неверагодным падабенствам, над немагчымасцю адважыцца на ўсынаўленне... А нядаўна я адплакала над карткай апошні раз. Глытала слёзы і... разрывала сумны тварык на драбнюткія «хвосцікі». Гэта стала свайго роду пахаваннем майго колішняга нармальнага чалавечага жадання — дапамагчы сіраце.

Можа, такім чынам я распісалася ў няздольнасці прыняць і палюбіць дзіця так, як я гэта сабе ўяўляю? А можа, я заблыталася ў «нормах» і ўстаноўках, навязаных мне грамадствам?

Тое, што ўсе свядомыя ці, як кажуць у народзе, «нармальныя людзі» хоць бы раз у жыцці разважалі над магчымасцю ўсынаўлення сіраты, — факт. Аднак досыць сціплая лічба ператварэння разваг у намер — таксама факт. Чаму ж так мала людзей адважваюцца на акт дапамогі? Да 2007 года, Года дзіцяці, дарэчы, у нашай краіне фіксавалася 300—400 усынаўленняў у год, апошнія два гады — звыш 500. Безумоўна, гэта прагрэс. І стаў магчымым ён дзякуючы ў тым ліку больш шырокаму абмеркаванню гэтай тэмы ў грамадстве, празрыстасці работы Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення, на сайце якога можна атрымаць любую інфармацыю. Аднак колькі яшчэ часу запатрабуе ад нашага грамадства прагрэс, каб мы дасягнулі вяршыні ў справе закрыцця дзіцячых дамоў? Права набыць новых бацькоў маюць на сёння 14 тысяч дзяцей! Падрабязней кажучы, статус сіроцтва сёння ў краіне маюць каля 30 тысяч дзяцей, сярод якіх — і тыя, чыіх бацькоў пазбавілі бацькоўскіх правоў, і тыя, чые бацькі адбываюць пакаранне ў месцах зняволення і г.д. Груба кажучы, дзесьці каля паловы такіх дзяцей пражываюць у сем'ях апякунскіх, гэта значыць, не могуць быць усынаўлёнымі, а другая палова ўсынаўлёнай быць можа. У апошнюю катэгорыю ўваходзіць, зноў жа, палова тых, што пражываюць у прафесійных замяшчальных сем'ях — напрыклад, у дзіцячым доме сямейнага тыпу або SOS-Дзіцячай вёсцы і палова тых, што знаходзяцца ў дзяржаўных інтэрнатных установах.

...У многіх краінах свету няма дзіцячых дамоў. Дзеці, ад якіх адмаўляюцца ў раддамах або дзеці, чые бацькі загінулі, безумоўна, ёсць. Але сіроты без сям'і не застаюцца. Можна было б распачаць гарачае капанне ў меркантыльных матывах «буржуяў», аднак... глупства ўсё гэта па вялікім рахунку! Я не бяру да ўвагі выключныя выпадкі, калі з прынятых на выхаванне дзяцей здзекваюцца і г.д. Жорсткасці хапае ў любых краінах і ў дачыненні нават да родных дзяцей... Я кажу проста пра гатоўнасць шырокіх слаёў грамадства да такога кроку, як прыняцце на сваёй сямейнай тэрыторыі «чужых» дзяцей. Чаму ТАМ такая гатоўнасць ёсць, а Ў НАС яна... такая... мякка кажучы, сарамлівая? Грашова-заробкавае пытанне можна ў прынцыпе адкінуць адразу. Практыка паказвае: абсалютная большасць усынавіцеляў — не мільянеры з мільярдэрамі.

За мяжой думка аб усынаўленні можа прыйсці і людзям, якія маюць сваіх дзяцей, а ў нашым грамадстве гэта лічыцца прэрагатывай «няшчасных» бяздзетных... Маўляў, раз вы такія недарэчныя, дык што ж, бярыце чужое... Таму на сем'і, у якіх ёсць свае дзеці, але тыя бяруць яшчэ і чужых, глядзяць з вельмі вялікім падазрэннем.

Мала хто з навакольных бачыць у падобным парыве штосьці чалавечае. Не дзіўна, што многія суайчыннікі неяк нават пабойваюцца свайго намеру. І калі нават пераступаюць гэту боязь, усё адно жывуць з аглядкай, спрабуюць хавацца за тайну ўсынаўлення, узаконеную ў нашай краіне. А навошта хавацца? Псіхолагі сцвярджаюць: любая тайна — гэта заўсёды неўроз, міна запаволенага дзеяння. А тым больш у сям'і. Усё тайнае калі-небудзь... выбухне, і часам так, што ад сям'і нічога не застаецца.

Дацэнт кафедры сацыялогіі Заходне-Мічыганскага ўніверсітэта Алена ГАПАВА кажа, што ў амерыканцаў запатрабаваным можна лічыць паняцце тайны ў дачыненні да адзнак, якія ты атрымліваеш, а ў дачыненні да ўсынаўлення яно выглядае нават абсурдным. Вядома, што ў тых жа Штатах даволі жорстка дзейнічае «прынцып крыві». Гэта значыць, што там няма практыкі пазбаўлення бацькоў бацькоўскіх правоў. Скажам, пакуль маці злоўжывае алкаголем ці наркотыкамі, дзіця будзе выхоўвацца ў іншай сям'і, але да таго моманту, пакуль не «ачуняе» і не вернецца па родную крывінку.

У ЗША «прынцып крыві» не разбурыць ніводзін суд. З-за гэтага прынцыпу за акіянам фактычна немагчымае ўнутранае ўсынаўленне, а толькі, так бы мовіць, знешняе, з такіх краін, як Кітай, В'етнам, Расія... Якая ж тут ужо, дарэчы, тайна.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 809,00
▲ 1 еўра	4 047,49
1 латвійскі лат	5 763,82
1 літоўскі літ	1 172,03
1 чэшская крона	155,86
1 польскі злоты	981,02
▼ 1 расійскі рубель	90,09
1 украінская грыўня	355,57

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрбанк РФ

USD	31,1814
UAH	39,4701
1000 BYR	11,0966
EUR	44,9168

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

КАЛІ Ж ДЗЯЦЕЙ ХТО-НЕБУДЗЬ ПАЛЮБІЦЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А ў Германіі прапісана права дзіцяці ведаць свайго бацьку. Спецыяльныя службы робяць усё, каб устанавіць асобу апошняга, нават калі жанчына сцвярджае, што раджае для сябе ці наогул не ўпэўнена, хто гэта дакладна мог бы быць... Патэнцыйныя кандыдаты на бацькоўства будуць у рэшце рэшт абследаваны і (дзякуй сучасным медыцынскім тэхналогіям!) бацьку павіншуюць з новым клопатам, які будзе заключацца ў рэгулярным фінансавым падсілкаванні нашчадка.

Вось ён, канкрэтны, рэальны клопат ПРА ДЗІЦЯ! Не магу ў дадатак да тэмы не прывесці расповед спадарыні Гапавай аб тым, як аднойчы да яе звярнулася па дапамогу суседка — дама, якая ўсынавіла двух цудоўных хлопцаў з Расіі. Амерыканка спытала ва ўраджэнкі з Беларусі, якім чынам захаваць для дзяцей рускую мову, кухню, звычаі, каб яны не ператварыліся ў тых, хто «родства не помнит»?..

Прыгадваецца цудоўная стужка «Жорсткі раман», дзе галоўная гераіня вымаўляе сакраментальныя словы: «Усе сябе любяць... Калі ж хто-небудзь мяне любіць будзе?». Паспрабуйце паразмаўляць з кім-небудзь на тэму магчымага для вас усынаўлення дзіцяці, і вы абавязкова пачуеце разважанні аб тым, ці патрэбна гэта вам, ці хопіць у вас сілаў — фізічных і маральных — на тое, каб падняць дзіця. І ўсе мы так ставімся да гэтай справы. Нехта адважыўся і быццам бы робіць добры, чалавечы ўчынак, нібыта грошай за гэта не просіць, але ж усё адно нечага чакае ад гэтага ўчынку... для сябе. Хтосьці мяркуе пазбавіцца адзіноты, нехта думае, што Бог адпусціць грахі і дасць сваё дзіця... Меркантылізм атрымліваецца не прамы, а схаваны, ускосны.

Быў такі выпадак у адным з раёнаў нашай Беларусі. Добрая сям'я — мама і тата ўсынавілі дваіх дзяцей. Раптам матуля пачала сябе вельмі дрэнна адчуваць. Высветлілася — постадаптацыйная дэпрэсія. Як толькі жанчына бачыла дзяцей, ёй станавілася вельмі дрэнна, узнімалася тэмпература, адным словам, пра догляд дзяцей не магло быць і гаворкі. Выпадкова пасля адной з размоў з цешчай псіхолаг Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення зразумела, што ўся справа была ва ўстаноўцы, якую старая жанчына «заклала» ў сваю дачку, маўляў, дзеці... ПАВІННЫ РАДАВАЦЬ. Вось усынавіцелька пачакала пару дзён таго моманту, калі ад дзяцей пачне паступаць радасць і паглыбілася ў дэпрэсію. Дзяцей прыйшлося перадаць у іншую сям'ю.

...Намер усынаўленне не можа паходзіць ад таго, было б каму шклянку вады на старасці паднесці. Прыгадваю, дарэчы, шэраг шматдзетных сем'яў, якія маюць сваіх, скажам, шасцёра і бяруць яшчэ чатыры-пяць-шэсць сірот, утвараюць такім чынам дзіцячы дом сямейнага тыпу. Зразумела, такая форма выхавання — не ўсынаўленне, але, бадай, самая блізкая да апошняга форма, паколькі дзіця ўсё адно атрымлівае пражыванне ў сапраўднай поўнай сям'і...

Спытайце ў гэтых жанчын і іх мужоў, як яны выбіралі СВАІХ дзяцей у дзетдамах? Мушу запэўніць вас, што не заглядвалі ў медкарткі, не распытвалі, хто бацькі, наколькі здаровенькі, як паводзіць сябе... Вось, кажуць, мы як зайшлі ў групу, так да НАШАГА Сяржукі (Васількі, Танюшы...) рукі самі і пацягнуліся. Наша дзіця, і усё тут! Нават падобнае на нас! У такіх сем'ях вам ніколі не скажуць, маўляў, Колечка ў нас — апошні, хоць бы гэтых на ногі падняць. Гаспадыня засаромецца: думаю, гэта яшчэ — не мяжа... А ты — старонні назіральнік — адплачаш сітуацыю ў дарозе дадому, дзе цябе не чакае нічога падобнага.

Гераіня серыяла «Сэкс у вялікім горадзе» Кэры Брэдшоу абазначыла пачуццё бязмежнага кахання як «за-за-зу» — стан, калі ў жыцці трымцяць матылькі. Яна, праўда, мела на ўвазе пераважна каханне жанчыны да мужчыны або наадварот... Аднак, па сутнасці, можна прымяніць гэтае «за-за-зу» і ў дачыненні да любові ў цэлым. Верная прыкмета: няма трымцення — нічога не атрымаецца. Думаю, што калі вышэйзгаданыя жанчыны пераступаюць парог дзетдома, у іх жыцці пачынаецца рэакцыя «за-за-зу», абуджаецца жаданне падзяліцца, аддаць усё, што ёсць і нават больш... З такіх сем'яў дзеці амаль не вяртаюцца ўжо ў казённы дом. І ў такіх сем'ях абавязкова будзе каму паднесці шклянку вады...

Дарэчы, псіхолагі кажуць, што жаданне і магчымасць клапаціцца не толькі пра сябе — паказчык спеласці асобы. Як жа добра было б жыць у «спелым» грамадстве, дзе разабралі б і сваіх 14 тысяч, і Кітаю б дапамаглі...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Купляй сваё — жыві лепш: працяг тэмы

«ВЫПАДАК З НЕМАГЧЫМАСЦЮ КУПІЦЬ АЙЧЫННЫ МАРАЗІЛЬНІК — НЕ АДЗІНКАВЫ»

У нумары газеты ад 5 жніўня пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» была змешчана скарга жыхара вёскі Канюхі Капыльскага раёна, які наракаў, што разам з жонкай не можа знайсці на тэрыторыі двух раёнаў — свайго і суседняга Слуцкага — маразільнік вытворчасці «Атланта». Маўляў, пайшоў другі тыдзень тых пошукаў, а вынік нулявы. Як маглі, мы спрабавалі высветліць сітуацыю і дапамагчы нашаму заяўніку. Не атрымалася, хоць звярталіся мы ў раённыя спажывецкія таварыствы абодвух раёнаў. На працягу дня былі безвыніковымі і спробы атрымаць каментар ад прадстаўнікоў самога прадпрыемства-вытворцы. Але гэтую надзею мы не страчвалі і пасля выхаду публікацыі 5 жніўня адразу ж накіравалі адпаведны факс на «Атлант» (такой была просьба адтуль).

Даволі аператыўна з завода патэлефанаваў адзін з начальнікаў. Пішам так, паколькі прадстаўнік завода даў толькі папярэднюю інфармацыю, якую, праўда, дазволіў выкарыстоўваць, аднак заўважыў, што больш падрабязны адказ, напэўна, будзе рыхтавацца пазней, але кім і як — ён не ведае. Маўляў, трэба яму паразмаўляць з камерцыйным дырэктарам, той дасць даручэнне і з рэдакцыяй звяжуцца. Пра тэрміны зноў жа нічога не сказаў і адмовіўся даць свой нумар тэлефона. На працягу дня з прадпрыемства больш ніякіх званкоў не было, таму мы рэдакцыйны запыт прадублявалі ўжо цалкам афіцыйна — па пошце, а пакуль на заводзе рыхтуюць адказ на яго, можам пераказаць гутарку, што адбылася.

— Вы падрыхтавалі публікацыю, а меркаванне іншага боку не спыталі. А ў любой праблемы заўсёды ёсць і другі бок медаля...

— Прабачце, нам такой магчымасці не далі, папрасілі пісьмовы зварот, якой газетны матэрыял і з'яўляецца. Дзякуй, што патэлефанавалі. У вас ёсць магчымасць выказацца. Што можаце сказаць па ўзнятай вяскоўцам праблеме?

— Мы паднялі дакументы. Капыльскае раённае спажывецкае таварыства — адзінае ў Мінскім аблспажыўсаюзе, якое плаціць дрэнна, мы нават выслалі прэтэнзію... Па Слуцку сітуацыя нармальная.

— Напэўна, гэта мае значэнне. Але давайце разглядаць сітуацыю з пункту погляду простага пакупніка, якому няма розніцы, якія стасункі паміж суб'ектамі гаспадарання. Ён мае грошы і хоча купіць патрэбны тавар, прычым з цвёрдым перакананнем, што ён павінен быць выключна айчынным. У нашым выпадку — маразільнік. А зрабіць гэтага не можа? Чаму? Маразільнікай вырабляецца недастаткова шмат?

— Зразумейце, перавесці прадпрыемства на выпуск толькі маразільнікаў тэхналагічна не магчыма. Мы задавальняем патрэбы. Калі на працягу года ў агульным аб'ёме нашай прадукцыі маразільнікі займаюць 6 працэнтаў, дык на летнія месяцы іх вытворчасць павялічваецца да 12 працэнтаў.

— Умоўна кажучы, са 100 адзінак вырабленай вамі летам складанабытавой тэхнікі толькі 12 складаюць маразільнікі? На ваш погляд, гэтага дастаткова?

— Нельга па адным выпадку меркаваць увогуле. Скажам, мы прапануем гандлю маразільнікі ў асартыменце, а ён хоча браць найперш толькі дзве больш танныя мадэлі, скажам, мадэль 4012...

— Магчыма, таму, што яны карыстаюцца найбольшым попытам у насельніцтва?

— Больш танныя мадэлі дазваляюць зарабляць, робячы на іх накрутку... Паўтараю, намі адпушчана максімальная колькасць маразільнікаў.

Як мы сказалі вышэй, на дадзены момант гэта адзіная папярэдняя інфармацыя з завода па сітуацыі, што ўзняў заяўнік. А вось ад нашых чытачоў яна працягвала паступаць. Увечары таго ж 5 жніўня ў рэдакцыю патэлефанавала жыхарка Гродна Тамара Браніслаўна Манцэвіч.

— Я сутыкнулася дакладна з такой жа праблемай — немагчымасцю на працягу двух тыдняў набыць маразільнік вытворчасці «Атланта» на тэрыторыі Гродна і раёна. Украінскія і расійскія ёсць, айчынных няма. Прадаўцы адказвалі, што такая сітуацыя паўтараецца кожны год. Я асабіста тэлефанавала на «Атлант», цікавілася, у чым справа ў адказнага за наш рэгіён спецыяліста завода (названа прозвішча. — **С.Р.**), тая работніца сказала, маўляў, у Мінску ў фірменнай краме маразільнікі ёсць. А ў нас чаму няма? Я гэтым была абурана да немагчымасці, як і ваш папярэдні заяўнік. Звярталася ў Камітэт дзяржкантролю..., — распавяла нам у тэлефоннай гутарцы Тамара Браніслаўна.

Паводле яе далейшых слоў, патрэбны ёй маразільнік яна ўсё ж набыла. Якім чынам? Калі без асабістых падрабязнасцяў, дык «купілі праз знаёмых». А вось сяброўцы Тамары Браніслаўны пашчасціла менш: пабегала тая ў пошуках атлантаўскага маразільніка безвынікова, ды і купіла расійскі. Падтрымала, выходзіць, замежнага вытворцу. А як было не падтрымаць, калі, напрыклад, у адзін з гандлёвых дамоў абласнога цэнтра, як заўважыла далей суразмоўца, даслалі нядаўна толькі чатыры айчынныя маразільнікі...

Не ведаючы, пра размову з прадстаўніком завода, Тамара Браніслаўна некалькі разоў паўтарыла: выпадак з вашым папярэднім заяўнікам — далёка не адзіны.

P.S. *Рэдакцыя па-ранейшаму чакае афіцыйнага рэагавання з ЗАТ «Атлант». Ніхто нават пад сумненні не ставіць якасць яго прадукцыі — многія хочуць набыць толькі і выключна прадукцыю ад гэтага вытворцы. Толькі сітуацыя з адсутнасцю ў свабодным продажы ў дастатковай для задавальнення попыту колькасці тых жа маразільнікаў людзям не зразумелая.*

Сяргей РАСОЛЬКА.

АФІЦЫЙНЫ КАМЕНТАР

«ВЫНІКІ СВЕДЧАЦЬ ПРА ПОЎНАЕ ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЕ ГАНДЛЮЮЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ЗАТ «АТЛАНТ» У ЧАСТЦЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЫТАВОЙ ТЭХНІКАЙ»

Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, рэдакцыя «Звязды» атрымала адказ з ЗАТ «Атлант» на артыкул «Шукаў вясковец у спёку айчынны «холад»...» Прывядзём на старонках газеты толькі тыя яго часткі, што непасрэдна датычацца ўзнятай чытачом праблемы.

«У перыяд за студзень — ліпень 2009 года факт пастаўкі халадзільнікаў (маразільнікаў) «Атлант» вытворчасці МЗХ склаў 101 959 шт. (за аналагічны перыяд 2008 года — 87 837 шт.), што складае 116 працэнтаў да 2008 года...

Планы вытворчасці ЗАТ «Атлант» фарміруюцца, зыходзячы з вытворчых магутнасцяў, забеспячэння аб'ёмных паказчыкаў па тэмпах росту, а таксама з улікам магчымасці максімальна задавальнення заявак пакупнікоў як пры пастаўках на ўнутраны рынак, так і на экспарт...

...ЗАТ «Атлант» увесь час працуе над папаўненнем мадэльнага рада прадукцыі, што вырабляецца, і імкнецца да найбольш поўнага выканання заявак патэнцыяльных пакупнікоў прадукцыі «Атлант». Гандлёвым арганізацыям Рэспублікі Беларусь прадукцыя ЗАТ «Атлант» прапануецца ў асартыменце, згодна з рэсурсамі, што маюцца. Пры адсутнасці заяўленай мадэлі маецца магчымасць замяніць яе на найбольш блізкую па тэхнічных характарыстыках і вонкавым дызайне…

Для павышэння даходнасці гандлюючых арганізацый, забеспячэння аптовых продажаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на ЗАТ «Атлант» уведзена сістэма стымулюючых зніжак. Для забеспячэння раўнамерных паставак у летні перыяд павышанага попыту на ЗАТ «Атлант» уведзена сістэма планавання падачы транспарту пад загрузку. На працягу ліпеня 2009 года гандлюючым арганізацыям Рэспублікі Беларусь штодзень адгружалася каля 1000 — 1200 штук прадукцыі.

Капыльскае раённае спажывецкае таварыства з пачатку 2009 года атрымала 296 халадзільнікаў (маразільнікаў) «Атлант», у тым ліку 70 маразільнікаў, што складае 24 працэнты ад агульнай колькасці атрымманай прадукцыі, у той час, як працэнтныя суадносіны маразільнікаў у агульным плане вытворчасці ЗАТ «Атлант» складаюць каля 4 працэнтаў.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што Капыльскае раённае спажывецкае таварыства адзінае ў Мінскай вобласці мае пратэрмінаваную дэбіторскую запазычанасць за атрыманую прадукцыю. Яму выстаўляліся прэтэнзіі за адхіленні ў тэрмінах аплаты.

Лічым, што існуючыя вынікі сведчаць пра поўнае ўзаемаразуменне гандлюючых арганізацый і ЗАТ «Атлант» у частцы забеспячэння насельніцтва Рэспублікі Беларусь якаснай і даступнай бытавой тэхнікай айчыннай вытворчасці. Пытанні, што ўзнікаюць, вырашаюцца ў працоўным парадку з кожнай гандлюючай арганізацыяй».

Да гэтага адказу цяжка нешта дадаць, каб зноў не паўтарыцца. Хіба толькі рытарычнае пытанне: хіба 70 маразільнікаў з пачатку года (выходзіць, у сярэднім па 10 штук у месяц, калі браць і ліпень уключна) на ЎСЁ насельніцтва ЦЭЛАГА раёна — гэта дастаткова?..

Сяргей РАСОЛЬКА.

Абзац

◢ Дзень буякоў прайшоў учора ў Цэнтральным батанічным садзе НАН Беларусі. На выстаўцы-кірмашы былі прадэманстраваны як традыцыйныя, так і новыя для Беларусі гатункі гэтай ягады. Саджанцы і ягады ў Мінск прывезлі фермеры з усіх рэгіёнаў краіны. Найбольш шырока прадставілі сваю прадукцыю гаспадаркі паўднёвых раёнаў — Пінскага і Ганцавіцкага. Усе, хто хацеў, купілі пасадачны матэрыял ці ягады, атрымалі рэкамендацыі па вырошчванні культуры.

◢ Пры будаўніцтве жылога дома ў Брэсце загінуў рабочы. Нясшчасны выпадак адбыўся на будаўнічай пляцоўцы ў раёне вуліцы Леніна. 43-гадовы рабочы сарваўся і загінуў. Пракуратура праводзіць праверку.

◢ Згодна са звесткамі Еўрапола, штогод у краінах Еўрасаюза зладзеі зганяюць каля мільёна легкавых аўтамабіляў. Лідарамі ў спісе сталі Вялікабрытанія, Італія і Францыя, дзе штогод прападае каля 200 тыс. аўтамабіляў.

◢ Пяць чалавек пацярпелі ў ДТЗ з удзелам маршруткі ўчора ў Мінску. Аварыя адбылася непадалёк ад выезду з горада ў магілёўскім кірунку. Вадзіцель аўтамабіля «Фальксваген—Пасат», груба парушыўшы правілы дарожнага руху, паварочваў налева з другой паласы, перасякаючы адначасова 3 паласы. Па 4-й паласе рухаўся МАЗ, і яго вадзіцель, каб пазбегнуць сутыкнення, рэзка затармазіў і прыняў улева. Вадзіцель маршруткі не паспеў зрэагаваць і ўрэзаўся ў МАЗ. 5 яго пасажыраў дастаўленыя ў бальніцы з рознымі траўмамі.

◢ Амаль у Br50 млн ацаніла міліцыя сон вартаўніка аднаго з аптовых рынкаў сталіцы. Са склада вынеслі амаль 5 тыс. бутэлек спіртнога, з якіх 3,5 тыс. гарэлкі, 80 бутэлек бальзаму і 1,2 тыс. бутэлек каньяку. Як вядома, у кішэнях столькі не вынесеш, як мяркуецца, машына вывозіла прадукцыю не ў адну ноч. Заяву ў міліцыю вартаўнік зрабіў толькі па ўказанні ўладальніка спіртнога. Бачных прыкмет узлому не выяўлена.

◢ Надзвычайнае здарэнне адбылося ў Запарожжы: на вачах у адпачывальнікаў аўтамабіль BMW-520 пераехаў дзяўчыну, што ляжала на пляжы вострава Хорціца. Па словах відавочцаў, 23-гадовы вадзіцель, які быў за рулём, быў моцна п'яны. Гэта пацвердзілі і супрацоўнікі ДАІ. Пасля наезду на дзяўчыну машыну занесло, яна апынулася ў вадзе. У 17-гадовай пацярпелай пераламаныя косці таза, здаўленыя абедзве галёнкі. Яна дастаўлена ў рэанімацыю. Праводзіцца праверка ўсіх акалічнасцяў.

Поўны абзац

◢ Кітайская нявеста з правінцыі Цзылінь у чацвер устанавіла сусветны рэкорд. На цырымоніі рэгістрацыі шлюбу яна была апранутая ў вэлюм даўжынёй у 2 кіламетры і 162 метры. Вэлюм упрыгожаны 9999 шаўковымі ружамі, у яго ўплецена 608 паўкаштоўных камянёў — роўна столькі дзён таму пазнаёміліся маладыя. Шлюбны строй для 25-гадовай кітаянкі сшыў яе жаніх. На выраб вэлюму пайшло тры месяцы і амаль 6 тыс. долараў. Уладальнікі самага доўгага вэлюму падалі заяўку ў Кнігу рэкордаў Гінэса. Хоць наваспечаны муж сцвярджае, што ён проста хацеў парадаваць сваю нарачоную.

◢ Кур'ёзны інцыдэнт адбыўся ў сераду на курорце Малія на востраве Крыт. 20-гадовы брытанец у стане алкагольнага ап'янення спрабаваў прыставаць у бары да 26-гадовай студэнткі з Грэцыі. Зняважаная яго непрыстойнымі жэстамі, дзяўчына схапіла бутэльку з алкагольным напоем, выліла яе змесціва на маладога чалавека і падпаліла запальнічкай, пасля чаго знікла. Турыст быў дастаўлены ў бальніцу з апёкамі 2-й ступені на жываце і грудзях. Студэнтка прыйшла павінніцца ў пракуратуру праз некалькі гадзін пасля інцыдэнту.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

МІКРААЎТОБУС «НАЕХАЎ» НА ДВА АЎТАМАБІЛІ

Чацвёра чалавек пацярпелі і адзін загінуў у буйным дарожна-транспартным здарэнні, якое адбылося на дарозе паблізу вёскі Сычкова, што ў Бабруйскім раёне.

Паводле звестак ДАІ МУС, тут 36-гадовы кіроўца мікрааўтобуса «Таёта» сутыкнуўся з аўтамабілем «Жыгулі», які рухаўся ў спадарожным напрамку. Пасля ўдару «Таёту» вынесла на сустрэчную паласу, па якой у гэты час рухалася аўтамашына «Міцубісі»: гэтыя машыны таксама сутыкнуліся. У выніку ДТЗ загінуў 41-гадовы непрацуючы жыхар Бабруйска, які знаходзіўся за рулём «Міцубісі». Пасажырка апошняга, а таксама кіроўца «Таёты» і яго двое пасажыраў, вяскоўцы з Бабруйскага раёна, змешчаныя з траўмамі ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ
о покупке акций ОАО «Технобанк»

1. Фамилия, имя, отчество, место жительства покупателя акций: Курач Игорь Александрович, проживающий по адресу: 220022, город Минск, улица Горецкого, дом 77, квартира 37.

2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество «Технобанк», 220002, город Минск, улица Кропоткина, 44.

3. Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель: 585 558 (Пятьсот восемьдесят пять тысяч пятьсот пятьдесят восемь) штук.

4. Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции: 558 (Пятьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей за 1 (Одна) акцию.

5. Форма и порядок оплаты акций: оплата в безналичной форме в белорусских рублях через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (код расчетов S-T+n).

6. Сроки оплаты акций: не позднее 5 (Пять) календарных дней со дня заключения сделки.

7. Адрес, по которому будет совершаться покупка акций: город Минск, улица Сурганова, 48А, Открытое акционерное общество «Белорусская валютно-фондовая биржа».

8. Дата начала и окончания покупки акций: 13 августа 2009 года – 14 августа 2009 года.

И.А. Курач

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Копыльский маслосырзавод» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) проводит повторный открытый аукцион по продаже *имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод»*, расположенного по адресу: *г. Столбцы, ул. Свердлова, 3,* в составе *зданий:* производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, 201,7 кв.м, здание прачечной, об. пл. 109,6 кв.м, автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл, 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, *сооружений:* башня водонапорная, ограждение вокруг завода, передаточных механизмов: кабельные сети к силовому оборудованию, трасса газовая производственная 500 АЧ, сети связи воздушные, сети электроосвещения, сети канализационные, сети паропроводные, сети канализационные чугунные, а также *оборудования* и иного имущества согласно списку. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 2 720 191 177 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Рядом с участком имеется ж/д ветка Брест–Минск. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **18.08.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.08.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

ПАДАЮЧЫ Ў СПІС ЮНЕСКА АДНЫ АБ'ЕКТЫ, МЫ НАЗІРАЕМ ЗА РАЗБУРЭННЕМ ІНШЫХ?

Рыштаванні Бацькаўшчыны: на скрыжаванні думак

У Беларусі чатыры аб'екты ўключаныя ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Многа гэта ці мала? Нармалёва, бо ва Украіне, якая нашмат большая па плошчы, такіх аб'ектаў усяго тры. А ў некаторых краінах — адзін ці ніводнага. Па якім прынцыпе мы прапануем аб'екты ў гэты Спіс? Чаму нам адмаўляюць? Што дае Спіс ЮНЕСКА Беларусі? Чаму адначасова іншыя помнікі архітэктуры знікаюць, разбураюцца, няграматна рэстаўруюцца?.. Гэтыя пытанні я паспрабаваў высветліць у дзвюх гутарках — з чыноўнікай Міністэрства культуры і экспертам-культуролагам.

Аксана СМАТРЭНКА, намесніца начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры:

«КАЛІ АБ'ЕКТ У СПІСЕ ЮНЕСКА — ГЭТА ПРЭСТЫЖНА ДЛЯ КРАІНЫ!»

— Спадарыня Аксана, цягам апошняга года ў прэсе рэгулярна з'яўляюцца паведамленні адносна нашых амбіцый што да Спісу сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. То мы Камянецкую вежу падаём, то Мураванку, то Сафійскі сабор, пару дзён таму я прачытаў пра Гомельскі палац... Асабіста ў мяне ўзнікла адчуванне, што мы ўсё падаем — а аддачы ніякай...

— Не зусім так, што вось — падаём. Рыхтуюцца матэрыялы. Ёсць такі дакумент, дзе вызначаная падрыхтоўка дасье на пяць аб'ектаў для прапановы ў згаданы вамі Спіс. Гэта — Аўгустоўскі канал, полацкія каштоўнасці («Увасабленне духоўнай спадчыны Еўфрасінні Полацкай»), абарончыя храмы (Мураванка, Сынкавічы, Камаі, магчыма, Быхаўская сінагога), драўлянае дойлідства Палесся, Брэсцкая крэпасць. Аднак у адпаведнасці з міжнароднымі правіламі за год можна падаваць толькі адно нацыянальнае дасье і адно транспамежнае — разам з суседнімі краінамі (так была ўключана ў Спіс, скажам, Белавежская пушча).

— Дык гэта ў нас на пяць гадоў наперад планы?

— Так! Бо казаць, што мы ўсё падаём — няпраўда. Ніхто за раз столькі глядзець не будзе!.. У гэтым годзе мы прапанавалі дасье па Полацку і транспамежнае дасье па Аўгустоўскім канале. Чакаем, пакуль прыедзе эксперт паглядзець канал на свае вочы.

— А з Полацкам, я чуў, нас пракінулі?..

— Не зусім так. Дасье па Полацку было разгледжана на сесіі ЮНЕСКА. Аднак, калі выехаў эксперт знаёміцца з аб'ектам, было рэкамендавана ўзяць дасье на дапрацоўку... Гэта не адмова, бо інакш мы не маглі б падаваць паўторна.

— А ў чым там сталася праблема з Полацкам?

— Наколькі я ведаю, было заўважана, што працы, якія сёння праводзяцца ў гістарычным цэнтры Полацка, не адпавядаюць стандартам...

— Напрыклад, залатая цыбуліна на Спаса-Еўфрасіннеўскай царкве, якая заўжды была зялёная — нават на каляровых здымках Пракудзіна-Горскага пачатку XX стагоддзя?..

— Не толькі… Бо там жа падаецца не толькі Еўфрасіннеўскі манастыр.

— Чаму так адбываецца, што мы падаём — а нам вяртаюць?

— Гэта знак Міністэрству культуры, што трэба больш пільна сачыць, каб дасье не ішлі ў ЮНЕСКА недапрацаванымі, сырымі. Да таго ж, аб'екты, якія мы толькі плануем у будучым прапаноўваць для ўнясення ў Спіс — ужо сёння мы павінны апекавацца імі з падвышанай увагай, узмоцнена кантраляваць іх аднаўленне і абслугоўванне. Каб не атрымаліся сайдынгавыя сцены і пластыкавыя вокны.

— Таму зараз у Сынкавічах знішчаюць старую дранку на пяцісотгадовай царкве?..

— Там робяць аналагічную! Якраз тут усё робяць добра.

— Значыцца, паведамленне адносна розных помнікаў — гэта далёкія планы?

— Гэта — мэта для аблвыканкамаў, што трэба праводзіць працы, канцэнтраваць сродкі, складаць дасье... Няхуткі працэс. Напрыклад, што да абарончых храмаў, магчыма, аб'яднаемся з палякамі — каб далучыць да нашых храмаў яшчэ Супрасль. Магчыма, Літву далучым...

— Адкрыйце для чытачоў «Звязды» таямніцу — што будзем прапаноўваць ЮНЕСКА далей, пасля згаданых пяці аб'ектаў.

— Спіс папярэдніх кандыдатур быў складзены ў 2009 годзе ў супрацы з адмыслоўцамі ЮНЕСКА. Там ёсць Камянецкая вежа, Каложская царква ў Гродна, Мікалаеўская царква ў Магілёве, Гомельскі палац, архітэктурны ансамбль праспекта Скарыны ў Мінску, Крычаўскі палац, сядзіба ў Красным Беразе Жлобінскага раёна, палац у Жылічах, касцёл святога Юзэфа ў Валожыне...

— А ён чым адметны? 1806 год. Ёсць і больш вартыя і старыя ў нас аб'екты. У пераліку няма, скажам, Ішкалдзі — найстарэйшага касцёла ў Беларусі!..

— Дык ніхто ж не кажа, што гэты спіс канчатковы! Чаму не? Час ідзе, будзем разглядаць прапановы. Усё адначасова ў Спіс сусветнай спадчыны не прапануеш...

— Справа, якая была на слыху — гэта адмова Міністэрства культуры разгледзець як варты аб'ект урочышча Курапаты — мемарыяльны комплекс ахвярам сталінскіх рэпрэсій. Чаму? Асвенцім у Польшчы ўключаны ў Спіс...

— Разумееце, Асвенцім — гэта аб'ект, а ў нас Курапаты — гэта лес...

— Гэта — магілы дзясяткаў тысяч нявінна забітых людзей.

— Так, гэта магілы, якія, аднак, сёння выглядаюць як лес...

— А Дуга Струвэ, уключаная ў Спіс — гэта, умоўна кажучы, нейкія жалязнякі...

— Матэрыял па Дузе Струвэ быў падрыхтаваны вельмі цікава — таму і прайшло. У сваёй адмове па Курапатах Міністэрства культуры пісала — падрыхтуйце матэрыялы!.. Каб прапанаваць, трэба, каб гэта было цікава падрыхтавана!..

— А хіба не Мінкульт павінен займацца падрыхтоўкай дасье?

— Не, не Мінкульт, а спецыяльны творчы калектыў, працоўная група. Мінкульт далучаецца на пазнейшым этапе. Напрыклад, па Брэсцкай крэпасці нам прыйшло дасье з аблвыканкама — каб мы разгледзелі. Атрымаем гатовы матэрыял па Курапатах — разгледзім, мы абавязаныя гэта зрабіць!

— Чатыры аб'екты, уключаныя ў Спіс ад Беларусі — гэта многа ці мала?

— Канешне, мала! Аднак, ёсць краіны, дзе яшчэ менш.

— Увогуле, навошта мы імкнёмся да прысутнасці ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Што нам гэта дае?

— Найперш — міжнароднае прызнанне. Мы прадстаўляем сябе на міжнароднай арэне. І калі раней ніхто пра нас не ведаў і не чуў, то зараз Беларусь — гэта ўжо не невядомая планета...

— А грошы? Гэта прыносіць нейкія фінансавыя дывідэнды?

— Не. Ані на Мір, ані на Нясвіж не было атрымана ні капейкі...

— Вы сказалі пра намер прапанаваць ЮНЕСКА драўлянае дойлідства Палесся... Пару дзён таму «Звязда» надрукавала артыкул пра ўнікальную Петрыкаўскую царкву, якая з-за бяздзеяння за апошнія некалькі гадоў практычна разбурылася... То бок, нешта мы падаём, а на нешта заплюшчваем вочы?..

— Я ведаю гэтую царкву, гэта наш боль. Па гэтым аб'екце распрацаваная праектная дакументацыя. Тое, што давялі да таго, што дах абрынуўся — гэта, канешне, бязладдзе! Аднак літаральна сёння Мінкульт выдаў дазвол на правядзенне супрацьаварыйных прац на гэтай царкве. Там праблемы ў адсутнасці фінансавання...

Сяргей ХАРЭЎСКІ, гісторык архітэктуры, магістр мастацтвазнаўства:

«ЗА АПОШНІЯ 20 ГАДОЎ МЫ СТРАЦІЛІ ТРАЦІНУ НАШЫХ ПОМНІКАЎ АРХІТЭКТУРЫ»



— Як вы лічыце, з чым звязаная актывізацыя ў справе падавання аб'ектаў-кандыдатаў у Спіс ЮНЕСКА?

— Я думаю, гэта звязанае з жаданнем дзяржавы зрабіць новы імідж Беларусі, надаць Беларусі больш еўрапейскага люксусу. Натуральна, у гэты комплекс ідэй неад'емным складнікам уваходзіць і дбанне пра культуру, гісторыю, традыцыі. І Беларусь, якая прадстаўленая ў ЮНЕСКА вельмі сціпла, выкарыстоўвае гэтую пляцоўку для самарэкламы. Хоць насамрэч Спіс сусветнай спадчыны, роўна як і Нобелеўская прэмія, і Еўрабачанне — гэта не панацэя, і не ісціна ў апошняй інстанцыі. Помнікі, пастаўленыя на улік у Спісе ЮНЕСКА, могуць мець пэўнае фінансаванне, але толькі ў выпадку форс-мажорных абставінаў — катастрофы, раптоўных пашкоджанняў. Але ніхто іх не будзе рэстаўраваць і зберагаць за нас у паўсядзённым побытавым жыцці. У той жа час я бачу ў гэтай працы з ЮНЕСКА адзін важны чыннік. Працуючы ў гэтым кірунку, нашы чыноўнікі пачынаюць разбірацца, глядзець, лазіць у даведнікі, цікавяцца — па сутнасці, яны самі для сябе адкрываюць нашу спадчыну. І гэтая самаадкрыцця многага вартая.

— А вам не падаецца, што прысутнічае пэўнае мітусенне — рэгулярна заяўляюцца ўсё новыя і новыя аб'екты-прэтэндэнты?.. Атрымліваецца неяк бессістэмна...

— Логіка тут такая — узяць нейкія брэндавыя для Беларусі аб'екты з якімі, на думку чыноўнікаў, не трэба шмат працаваць. Яны шчыра здзіўляюцца, чаму нам адмовілі з Камянецкай вежай!.. І ўжо пасля аказваецца, што нельга было выкідаць драўляныя лесвіцы і ўстаўляць арматурныя і шклопакеты... Падобная сітуацыя з Аўгустоўскім каналам. Укладзеныя немалыя грошы, чакалася, што турысты проста ламануцца сюды. І мы не разумеем, чаму турысты працягваюць ездзіць на каналы Венецыі ці Амстэрдама, а не едуць глядзець закатаны ў бетон канал пад Гродна...

— Але шчырае жаданне патрапіць у Спіс ЮНЕСКА — гэта ж добра, мы так рэкламуем сваю спадчыну!..

— Спачатку нам трэба самім разабрацца, што для нас мае каштоўнасць. Што ў прэсе згадваецца часцей — Лінія Сталіна ці Крэўскі замак?..

— Аднак крытэры ЮНЕСКА — каб гэта здзіўляла свет, а не толькі беларусаў...

— Я думаю, што тут не будзе канфлікту:

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

7 ЖНІЎНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 29 (15583)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Працоўнае лета

СПРАВЕ ЧАС. І будуць грошы на пацеху

Табе 16 гадоў, альбо крыху менш, альбо крыху больш. У планах тваіх летніх канікулаў не пазначана падарожжа ў вёску (у летнік, на мора), і, хутчэй за ўсё, гэты час давядзецца бавіць у горадзе. Большасць сяброўкоў ужо ў раз'ездах і табе проста няма чым заняцца. Чаму тады не падацца на заробкі? Тым больш, што ўласныя грошы спатрэбяцца для таго, каб час, які застанецца пасля працы, правесці больш цікава. Напрыклад, зарабіць на тую ж дыскатэку цалкам магчыма ўжо нават у 14-гадовым узросце.

Каб заняць няпоўнагадовых хлопцаў і дзяўчат, органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне арганізоўваюць частковую занятасць на час канікулаў. Так, ствараюцца працоўныя месцы на аб'ектах, што фінансуюцца з бюджэту, як правіла, большасць з іх знаходзяцца ва ўстановах адукацыі. Школьнікі і навучэнцы прафтэхвучылішчаў прыводзяць у парадак свае класы, рамантуюць парты, латаюць кніжкі ў бібліятэках, працуюць у экабрыгадах па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі. У многіх хлопцаў і дзяўчат ёсць магчымасць стварыць добрую справу — яны шыюць пасцельную бялізну, робяць цацкі і сувеніры, якія пасля перадаюцца дзіцячым дамам. Прынамсі, матэрыялы, неабходныя для такой дзіцячай працы, гэтаксама як і заробак юных майстроў, фінансуюцца з фонду сацыяльнай абароны. Прыярытэтнае права на атрыманне такой летняй вакансіі атрымліваюць дзеці-сіроты, хлопцы і дзяўчаты з сем'яў, чые бацькі часова з'яўляюцца беспрацоўнымі, а таксама цяжкія падлеткі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

У НЕБА — НА СПАТКАННЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А ШТО З МІНДОЎГАМ?

Тым часам, як па ўсёй краіне няўхільна усталёўваюцца помнікі, многіх вельмі цікавіць лёс Навагрудка: калі дакладна, помніка Міндоўгу. Нагадаем, што ў першай сталіцы ВКЛ (чытай, Беларусі) ужо з пачатку года ідзе праца па падрыхтоўцы помніка нашаму першаму каралю (пра гэта чытайце ў нумары ад 8 мая). Стварэннем уласна помніка займаецца вядомы беларускі скульптар Генадзь Бураліkін. Адкрыццё помніка было запланавана на кастрычнік 2009 года, перад гэтым эскіз павінен быў прайсці мастацкую калегію і зацвердзіцца ў Міністэрстве культуры. Пра працэс падрыхтоўкі помніка «Звяздзе» распавёў **Вячаслаў ЛАЎРАШЧУК, галоўны спецыяліст аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама**:

— Сродкі паступаюць! І грамадзяне, і прадпрыемствы горада пералічваюць сродкі на разліковы рахунак аддзела культуры... У нас эскізны праект ёсць, яго зацвердзіла Міністэрства культуры. А цяпер мы працуем з архітэктарамі, каб зрабіць праект пасадкі-прывязкі... Ну, усё ж такі гэта будзе адзін з самых галоўных помнікаў рэспублікі, а таму ўсё павінна быць на ўзроўні, бо і сама плошча таксама з'яўляецца гістарычнай каштоўнасцю. Карацей, калі будуць фінансы, то, як кажуць, на міны!..

Спадар Вячаслаў упэўніў нас, што ўсё ідзе як і мае быць. Нам жа застаецца толькі пералічыць грошы на будаўніцтва помніка і чакаць ягонага хуткага адкрыцця. Сочым разам!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

ТАЛАКА:

Узяць удзел у зборы сродкаў на помнік Міндоўга можа кожны. Для гэтага дастаткова пералічыць любую суму на разліковы рахунак: «Аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама, 231400, г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 9а, р\р 3632000001310 ААТ «АСБ Беларусбанк», код 698, УНП 500031377. На выраб помніка Міндоўгу».

ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!
Віншуем з прафесійным святам — ДНЁМ БУДАЎНІКА
Калектыў ААТ «Завод керамзітавага гравію г. Новалукомль»

ОАО «ЗАВОД КЕРАМЗИТОВОГО ГРАВИЯ г. НОВОЛУКОМЛЬ»

Наша продукция комфортна, экологична и долговечна!

Тел./факс: (02133) 36031, 36611, 35308, 37347
www.keramzit.by e-mail: info@keramzit.by

Віншуем з уступленнем у шлюб **Вольгу і Дзяніса ПРЭСНЫХ**!

Жыццё пражыць — не поле перайсці...
Дык будзь жа бласлаўёным тое поле,
Вам па якім наканавана доляй
Назад не павяртаючы ісці.

Станкевічы, *г. Стоўбцы.*

Таццяну Барысаўну СУВОРАВУ з г. Оршы віншую з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, поспехаў у працы, здзяйснення жаданняў.

Валянцін КУШНЕР, *г. Орша.*

ЗАКАЗЫ АТРЫМЛІВАЕ ТОЙ, ХТО БУДУЕ ЯКАСНА І «ПАД КЛЮЧ»

9 жніўня — Дзень будаўніка

Штрыхі да партрэта Гродзенскага абласнога вытворчага праектна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднаабласельбуд»

Дзіцячы садок у Васілішках.

Стрэлкі гадзінніка яшчэ не наблізіліся да васьмі гадзін, аднак журналісты «Звязды» былі ў прыёмнай генеральнага дырэктара «Гроднаабласельбуда» Генадзя ЗАЛОГІ далёка не першымі. Нас апярэдзілі каля дзесяці чалавек, і прыйшлі яны, як высветлілася, у асноўным па пытаннях працаўладкавання. Пэўна, калі спецыяліст талковы, то адмовы з боку адміністрацыі не будзе, паколькі аб'ёмы будаўніцтва, насуперак эканамічнаму крызісу, сёлета павялічыліся: на 40 працэнтаў у супастаўных цэнах за студзень-чэрвень у параўнанні з тым жа перыядам мінулага года.

Што гэта рэальна азначае? Калі казаць аб жыллёвым будаўніцтве, то ў першым паўгоддзі «Гроднаабласельбуд» здаў у эксплуатацыю 222 дамы сядзібнага тыпу (17 680 квадратных метраў) і 250 кватэр ЖБК (16 329 квадратных метраў). А найважнейшымі аб'ектамі аграпрамысловага комплексу для сельскіх будаўнікоў сёлета з'яўляюцца дзевяць сучасных фермаў і вытворчыя цэхі племптушкарэпрадуктара «Юбілейны».

Рухавік прагрэсу

Наколькі абгрунтаваныя сцвярджэнні, што будаўніцтва з'яўляецца рухавіком прагрэсу для іншых галін эканомікі? **Намеснік генеральнага дырэктара «Гроднаабласельбуда» Канстанцін НІКОЛЬСКІ** лічыць, што гэта сапраўды так і прыводзіць канкрэтныя прыклады:

Намеснік генеральнага дырэктара Канстанцін НІКОЛЬСКІ.

— Вось пабудуем мы фермы па новых тэхналогіях (сёння яны ўзводзяцца ў Шчучынскім, Мастоўскім, Бераставіцкім, Лідскім, Навагрудскім, Дзятлаўскім, Слонімскім, Зэльвенскім раёнах) — значыць, будзе перспектыва і па мясной, і па малочнай жывёлагадоўлі. Альбо паглядзіце на аб'екты племптушкарэпрадуктара «Юбілейны». Яшчэ нядаўна неперспектыўнае, стратнае прадпрыемства сёння мае адзін з лепшых у рэспубліцы цэхаў па забоі і перапрацоўцы птушкі, а неўзабаве атрымае і сучасны цэх утылізацыі адходаў. Ды і будаўніцтва жылля вырашае не толькі сацыяльныя, але і эканамічныя задачы, паколькі служыць прыцягненню кадраў у сельгаскааператывы.

Аднак для таго, каб спрыяць прагрэсу ў іншых галінах эканомікі, будаўнічае прадпрыемства і само павінна адпавядаць самым сучасным патрабаванням. «Гроднаабласельбуд» сёння — гэта, можна сказаць, сапраўдны холдынг, які можа якасна выконваць практычна ўсе віды будаўнічых работ і здаваць аб'екты любой цяжкасці, як кажуць, «пад ключ». У яго складзе ажно 26 дачыных прадпрыемстваў у розных раёнах вобласці, прычым не толькі чыста будаўнічага профілю, але і па вытворчасці жалезабетонных і іншых канструкцый, вокнаў і дзвярэй з пластыку і алюмінію, аўтакамбінат, праектны інстытут. Пры гэтым кожнае прадпрыемства, выконваючы задачы аб'яднання ў цэлым, мае статус юрыдычнай асобы і не можа «схаваць» свае хібы за агульнымі паказчыкамі.

Цікава, што зарабляць на сябе нядаўна пачаў нават... абласны апарат кіравання. Цяпер ён ажыццяўляе не толькі кіраўніцкія функцыі ў дачыненні да дачыных прадпрыемстваў, але і, стварыўшы будаўніча-мантажны ўчастак, развівае ўласную падрадную дзейнасць. Для гэтага сёлета ўзялі на працу больш за сто рабочых, якія выконваюць і мантаж металаканструкцый, і апрацоўчыя работы, і ўстаноўку вокнаў...

І сапраўды, хочаш зарабляць грошы — улічвай патрабаванні будаўнічага рынку, зрабі свой імідж такім, каб пашыралася кола заказчыкаў. У «Гроднаабласельбудзе» так і ёсць. Здавалася б, будаўнікі сельскія, але аб'екты, як кажуць, на любы густ. З нядаўняй гісторыі можна прыгадаць аздараўленчы цэнтр Нацыянальнага банка Беларусі «Азёрны» (чатыры спальныя карпусы, лячэбны корпус, клуб, сталовая, кацельня, тэнісныя корты, пральня...), абласны псіханеўралагічны дыспансэр, домінтэрнат у Казлоўшчыне, польскую школу ў Ваўкавыску, завод медпрэпаратаў у Скідалі, паліклінікі ў Гродне, Навагрудку, гарадскім пасёлку Рось...

Кіраўнік «Гроднасельбудпраект» Анатоль МІКЛАШЭВІЧ (другі справа) з калектывам: вядучым архітэктарам Алай ПАНФЁРАВАЙ, галоўным архітэктарам Леанідам СІЛІЧАМ, галоўным інжынерам праекта Святланай ЛЯШУК і кіраўніком групы Галінай ЛЯЛІНАЙ.

Ды і цяпер «сельбудаўцы» запатрабаваныя не толькі ў аграпрамысловых галінах. Напрыклад, Шчучынская МПМК-166, паведаміў журналістам «Звязды» **галоўны інжынер Аляксандр САКАЛОЎСКІ**, сёлета будуе не толькі жыллё ў вёсцы, малочна-таварную ферму і аб'екты племптушкарэпрадуктара «Юбілейны», але і 40-кватэрны жылы дом у Шчучыне, будынак райаддзела міліцыі ў г. Чэрвені (Мінская вобласць), а таксама пагранпост у Воранаўскім раёне.

Начальнік плануючага аддзела «Гроднаабласельбуда» Павел АКУДОВІЧ.

Альбо такая праблема. На адным з аб'ектаў, напрыклад, «Гроднаабласельбуд» ужо выканаў работ прыкладна на 500 мільёнаў рублёў, а заказчыку яшчэ... не адкрыта фінансаванне. Даводзіцца генпадрадчыку браць крэдыты і на будаўніцтва, і на зарплату сваім работнікам, а пры гэтым яшчэ не хапае і крэдытных рэсурсаў. Пахвальна, безумоўна, што дамы ўсё ж узводзяцца. Аднак хіба ж любая цана прымальная? Зрабіўшы добрую справу, нельга дапусціць дрэнную — падарваць эканоміку будаўнічай арганізацыі.

Дарэчы, у сувязі з павелічэннем аб'ёмаў работ у «Гроднаабласельбудзе» палічылі неабходным узмацніць і кантроль за іх якасцю. Вырашылі, што на гэтым нельга эканоміць і папоўнілі адпаведную службу новымі спецыялістамі.

— Нашы галоўныя кантралёры — гэта людзі, для якіх мы будуем, — лічыць **начальнік аддзела кантролю якасці Галіна ДЗЕДАВЕЦ**. — Таму, каб не чырванець перад імі, патрабаванні да якасці выканання ўсіх вытворчых аперацый найстражэйшыя. Калі нешта зроблена з бракам, то гэта непасрэдна адбіваецца на зарплаце віноўнікаў і, зразумела, перарабляецца за іх кошт. Пры гэтым стараемся паказаць, чаму дапушчаны тыя ці іншыя хібы, каб іх не было надалей. Праводзім вучобу з інжынерна-тэхнічным персаналам і рабочымі, у найбліжэйшы час, напрыклад, мяркуем павысіць узровень ведаў нашых майстроў і прарабаў па выкарыстанні геадэзічнага інструменту і правільнасці выканання шэрагу іншых работ.

На ўчастку фармавання пліт пустотнага насціла безапалубкавым метадам майстар Васіль ЛАПІН і фармоўшчык Валерый ФУРМАН.

Новыя памяшканні для птушак у п. Свіслач.

Найсучаснейшы птушкакомплекс у Скідалі па перапрацоўцы птушкі і ўтылізацыі адходаў будуюць Юры ЯРМАК, Мікалай КІСЛУШКА, Андрэй ЛАВІЦКІ, Андрэй ЦІБЕЦ, Віталь ТАЛОЧКА, Сяргей ХАРЫТОНАЎ, Андрэй НОВІК і Валяр'ян ПАЦУК.

Галоўны інжынер Шчучынскай МПМК-166 Аляксандр САКАЛОЎСКІ.

Альбо такая праблема. На адным з аб'ектаў, напрыклад, «Гроднаабласельбуд» ужо выканаў работ прыкладна на 500 мільёнаў рублёў, а заказчыку яшчэ... не адкрыта фінансаванне. Даводзіцца генпадрадчыку браць крэдыты і на будаўніцтва, і на зарплату сваім работнікам, а пры гэтым яшчэ не хапае і крэдытных рэсурсаў. Пахвальна, безумоўна, што дамы ўсё ж узводзяцца. Аднак хіба ж любая цана прымальная? Зрабіўшы добрую справу, нельга дапусціць дрэнную — падарваць эканоміку будаўнічай арганізацыі.

Дарэчы, у сувязі з павелічэннем аб'ёмаў работ у «Гроднаабласельбудзе» палічылі неабходным узмацніць і кантроль за іх якасцю. Вырашылі, што на гэтым нельга эканоміць і папоўнілі адпаведную службу новымі спецыялістамі.

— Нашы галоўныя кантралёры — гэта людзі, для якіх мы будуем, — лічыць **начальнік аддзела кантролю якасці Галіна ДЗЕДАВЕЦ**. — Таму, каб не чырванець перад імі, патрабаванні да якасці выканання ўсіх вытворчых аперацый найстражэйшыя. Калі нешта зроблена з бракам, то гэта непасрэдна адбіваецца на зарплаце віноўнікаў і, зразумела, перарабляецца за іх кошт. Пры гэтым стараемся паказаць, чаму дапушчаны тыя ці іншыя хібы, каб іх не было надалей. Праводзім вучобу з інжынерна-тэхнічным персаналам і рабочымі, у найбліжэйшы час, напрыклад, мяркуем павысіць узровень ведаў нашых майстроў і прарабаў па выкарыстанні геадэзічнага інструменту і правільнасці выканання шэрагу іншых работ.

Начальнік аддзела кантролю якасці Галіна ДЗЕДАВЕЦ.

Альбо хіба ж не працуюць на якасць ужо традыцыйныя для «Гроднаабласельбуда» конкурсы прафесійнага майстэрства сярод плітачнікаў-абліцоўшчыкаў з прэміяваннем лепшых брыгад?

А пачынаецца кожны аб'ект, вядома ж, з праекта. Спецыялістам ДП «Гроднасельбудпраект» у сувязі з павелічэннем аб'ёмаў будаўніцтва не даводзіцца сумаваць без працы. Паводле слоў **кіраўніка прадпрыемства Анатоля МІКЛАШЭВІЧА**, асноўныя задачы на гэты год — фермы, якіх на Гродзеншчыне запраектавана 16, а таксама будаўніцтва новых і рэканструкцыя існуючых аб'ектаў ААТ «Васілішкі», што ўваходзіць у структуру Нацыянальнага банка Беларусі. Прычым праектная дакументацыя робіцца ў асноўным у разліку на мясцовыя матэрыялы. А што датычыцца жылых дамоў у сельскай мясцовасці, то на сёння ёсць усе ўмовы для таго, каб яны не нагадвалі блізнюкоў — каля 30 праектаў. Выбар — за заказчыкам, зразумела, з улікам меркавання архітэктараў «Гроднасельбудпраекта», каб жылы комплекс прыгожа глядзеўся.

Надзейнае партнёрства

У 2005 годзе, на момант далучэння да ААТ «Гроднахлебапрадукт» на правах філіяла племптушкарэпрадуктар «Юбілейны» выпусціў 2100 тон мяса і 1 мільён 900 тысяч яек. А цяпер адчуйце розніцу. Сёлетняя праграма — 25 тысяч тон мяса і каля 20 мільёнаў штук яек. І ў гэтым, лічаць вытворцы, вялікая заслуга не толькі галаўнога прадпрыемства і калектыву племптушкарэпрадуктара, але і іх надзейнага партнёра — «Гроднаабласельбуда».

— Мы запрашалі некалькі будаўнічых фірмаў, але спынілі выбар менавіта на «Гроднаабласельбудзе». І не шкадуем, цалкам задаволеныя тэмпамі і якасцю работ па будаўніцтве і рэканструкцыі нашых аб'ектаў, у прыватнасці, цэха забою і перапрацоўкі мяса птушкі на 6 тысяч галоў у гадзіну і мясаперапрацоўчага цэха па вытворчасці 1000 тон каўбасных вырабаў у месяц, — зазначае **галоўны інжынер племптушкарэпрадуктара «Юбілейны» Юрый СЯЎКО**. — Да падобных аб'ектаў прад'яўляюцца вельмі высокія не толькі чыста будаўнічыя, але і санітарныя, ветэрынарныя патрабаванні. І магу з поўнай адказнасцю сцвярджаць, што «Гроднаабласельбуд» нас не падвёў. Пра гэта сведчыць нядаўняя ацэнка Расветнагляда, які пацвердзіў адпаведнасць якасці мяса птушкі расійскім стандартам і даў дазвол на яго ўвоз у Расію. Вельмі добра прайшла і рэканструкцыя цэха інкубацыі, можна сказаць, радзільнага дома ў птушкагадоўлі. А цяпер, зноў жа ў партнёрстве з «Гроднаабласельбудам» завяршаем будаўніцтва яшчэ аднаго вельмі важнага і ў эканамічным, і ў экалагічным сэнсе аб'екта — цэха па ўтылізацыі адходаў, дзе будуць задзейнічаны літаральна ўсе астаткі, што атрымліваюцца пры забоі птушкі. Вось так разам з будаўнікамі мы ўдасканальваем сваю вытворчасць і робім яе канкурэнтаздольнай на рынках.

«Стараемся вырабляць усё, што сёння неабходна»

— кажа **Іван БУТРЫМ, дырэктар прадпрыемства «Лідабудканструкцыя»**, якое сёння забяспечвае ўсе МПМК «Гроднаабласельбуда» шырокім спектрам жалезабетонных вырабаў для жыллёвага і прамысловага будаўніцтва: плиты перакрыцця, блокі бетонныя для сцен падвалаў, плиты дарожнага насцілу, панэлі агароджы, вырабы для круглых каладзежаў, плиты стужачных фундаментаў і інш.

Дырэктар «Лідабудканструкцыя» Іван БУТРЫМ.

Скажам, павялічваецца будаўніцтва жылля — адпаведна ўзрастае патрэба і ў плітах пустотнага насцілу. Лідчане ўстанавілі новую лінію па італьянскай тэхналогіі, тым самым не толькі павялічыўшы магутнасць, але і скараціўшы ручную працу: кіраванне бетоназмяшальнікам ажыццяўляе аператар за камп'ютарам. У цэнтры ўвагі і праграма будаўніцтва жывёлагадоўчых фермаў: калі раней выраблялі чатыры так званыя ўмоўныя кароўнікі (увесь жалезабетон, як кажуць, «ад нуля да канька»), то цяпер — восем. А паколькі адна з ПМК «Гроднаабласельбуда» перайшла на мантаж жывёлагадоўчых памяшканняў не на фундаментных блоках, а на палях, то ўжо ў жніўні ў Лідзе пачнецца выпуск і гэтай новай прадукцыі.

— Цяпер вядзём перамовы на пастаўку перамычак керамзітавых, — зазначае Іван Бутрым. — Выпускаем жалезабетонныя, аднак калі трэба кліентам, то чаму б не зрабіць і керамзітавыя?

Шырокі асартымент вырабаў прапануе спажыўцам і цэх па вырабе элементаў для добраўпарадкавання тэрыторый: тратуарную плітку розных памераў і прызначэння, бардзюрнае каменне (дарожнае і газоннае), а таксама адзіныя ў рэспубліцы плиты пакрыцця трамвайных шляхоў. Якасць прадукцыі забяспечваецца сучасным абсталяваннем, прафесійным майстэрствам вытворцаў і выдатнай сыравінай — пяском з уласнага кар'ера з вельмі высокімі трываласнымі характарыстыкамі.

Дарэчы, на нядаўняй выставе «Ліда-рэгіён» вялікая цікавасць да прадукцыі прадпрыемства была менавіта ў насельніцтва. Рэагаваць на запыты рынку стараюцца хутка, адна з перспектыўных навінак, напрыклад, гэта тэрмаблокі на аснове керамзіту замест газасілікату. Яны, перакананы Іван Бутрым, будуць канкурэнтаздольнымі і па якасці, і па цане. А каб рабіць насельніцтву паслугі па дастаўцы тавару, нядаўна прадпрыемства атрымала ліцэнзію на грузаперавозкі.

Павялічыўшы ў першым паўгоддзі аб'ёмы вытворчасці больш чым на палову да леташняга ўзроўню, ДП «Лідабудканструкцыя» на сёння мае дэфіцыт кадраў інжынерна-тэхнічных прафесій. Запатрабаваныя спецыяльнасці тэхнолага, майстра фармовачнага ўчастка, інжынера-цеплатэхніка. Зарплата дастойная. Хто хоча працаваць, зазначае Іван Бутрым, зарабляе і больш за два мільёны рублёў.

ШАНОЎНЫЯ КАЛЕГІ!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з Днём будаўніка. Жадаю работнікам «Гроднаабласельбуда», а таксама іншых будаўнічых прадпрыемстваў рэспублікі, ветэранам, якія цяпер на заслужаным адпачынку, вашым сем'ям моцнага здароўя і добрабыту. Найлепшым прызнаннем нашай працы з'яўляецца ўдзячнасць людзей, для якіх мы ўзводзім жыллё, школы, паліклінікі, іншыя сацыяльныя і вытворчыя аб'екты. Будзем жа і надалей даражыць высокім прызначэннем прафесіі будаўніка!

Генадзь ЗАЛОГА, генеральны дырэктар Гродзенскага абласнога вытворчага праектна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гроднаабласельбуд»

Публікацыю падрыхтавалі Барыс ПРАКОПЧЫК, Алена ДАЎЖАНОК. Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

УНП 500039153.

Аграгарадок Свіслач.

СПРАВЕ ЧАС...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Так у Мінскай вобласці на арганізацыю другаснай занятасці хлопцаў і дзяўчат на перыяд летніх канікулаў было выдзелена 2,3 мільярда рублёў. «Мы імкнёмся ў першую чаргу ствараць месцы менавіта для школьнікаў, бо яны не такія канкурэнтаздольныя на рынку працы ў параўнанні, напрыклад, са студэнтамі. З дзятвой прадпрыемствы не хочуць працаваць, а падлеткаў трэба займаць і прывіваць ім ахвоту да працы», — заўважае **намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Валянціна МІРОНАВА.** Штогод у межах дзяржаўнай праграмы садзейнічання занятасці за кошт сродкаў з фонду сацыяльнай абароны магчымасць зарабіць першыя грошы атрымліваюць больш за 5 тысяч падлеткаў Міншчыны. Лічба не надта вялікая. Але, як правіла, такіх працоўных месцаў хапае на ўсіх ахвотных. Заробак тут дзеці атрымліваюць не вялікі (ён не перавышае мінімальнай зарплаты), але гарантаваны. Акрамя таго, для падлеткаў, якія наогул ніколі яшчэ не спрабавалі здабываць грошы, неблагі шанц пакласці гэтаму пачатак, адчуць сябе больш самастойнымі, незалежнымі, паспрабаваць прымераць на сябе пэўныя прафесіі, напрыклад, той жа швачкі. Ды і, пагадзіцеся, лепш мець хоць якую капейку ў кішэні, чым нічога. Заробак падлеткаў, якія заняты летам на вакансіях, створаных пры падтрымцы фонду сацыяльнай абароны, вылічваецца зыходзячы з тарыфнай стаўкі першага разраду з улікам карэктуючых каэфіцыентаў. Так у 14—16 гадоў можна зарабляць прыкладна 9 тысяч за дзень. Акрамя таго, ужо ў такім ўзросце можна абзавесціся працоўнай кніжкай і дзелавыя канікулы будуць залічвацца школьніку ў стаж.

Прынамсі, цяжкая праца, альбо такая, што можа прынесці шкоду здароўю, няпоўнагадовым забароненая. Службы занятасці прапануюць падлеткам вакансіі толькі на тых прадпрыемствах, якія маюць права на заключэнне дагавораў з юным пакаленнем. Прычым уладкоўвацца на працу дазваляецца толькі пачынаючы з 14 гадоў. І калі хлопцам і дзяўчатам няма яшчэ 16 гадоў, пры працаўладкаванні ім неабходна атрымаць на гэта пісьмовы дазвол ад аднаго са сваіх бацькоў.

Працоўны дзень хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў не павінен перавышаць 4 гадзін 36 хвілін, альбо 23 гадзіны на тыдзень. 16—18 гадоў — не больш як 7 гадзін, альбо 35 гадзін на тыдзень, і толькі пасля 18 гадоў моладзь працуе па звычайным графіку. Часткова таму, што падлеткаў не загрузіш па поўнай праграме, а пры гэтым плаціць ім неабходна па тарыфнай стаўцы як за поўны працоўны дзень, многія прадпрыемствы не хочуць браць іх да сябе на сезонныя месцы. Куды больш запатрабаваны старэйшы кантынгент. Акрамя таго, моладзь больш прасунутая, інфармаваная ды і ўпэўненая ў сабе, таму і перахоплівае летнія часовыя вакансіі ў няпоўнагадовых. Тым не менш некаторыя хлопчыкі і дзяўчаткі знаходзяць сабе падпрацоўку самастойна, асабліва тыя з іх, што жывуць у сельскай мясцовасці, дзе летам працоўныя рукі заўсёды патрэбныя. Гарадскім жа школьнікам на лета можа быць прапанавана праца ў парках адпачынку, прыбіранне тэрыторыі, пасадка раслін, работа кур'ераў. Некаторыя з іх расклейваюць аб'явы ці разносяць газеты. З 16 гадоў хлопцаў і дзяўчат бяруць у пункты харчавання, у асноўным для прыбірання памыканняў і мыцця посуду. Сярод больш творчых прапаноў разавыя «халтуры»: можна праводзіць сацапытанні, удзельнічаць у промаакцыях (калі вы добра сябе зарэкамендавалі), пры паўторных рэкламных кампаніях вам могуць зноў даць магчымасць падзарабіць), пакінуць заяўкі на «Беларусьфільме», каб зняцца ў масоўцы (але невядома, калі вас паклічуць на «кінапробу»).

Але, калі вы не можаце знайсці і такіх вакансій (праз знаёмых, інтэрнэт, абвесткі ў газетах), ёсць сэнс звярнуцца ў службу занятасці, ужо тут вам дапамогуць знайсці працу.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Акцыі

ЗДАРОВАЕ ЛЕТА... У НАШЫХ ДВАРАХ

Правядзенне рэспубліканскай акцыі «Лета — на здароўе» ініцыявала Міністэрства адукацыі нашай краіны. Яе задача — выяўленне і распаўсюджванне лепшага вопыту арганізацыі актыўнага адпачынку дзяцей, распаўсюджванне новых формаў работы з сям'ёй і папулярызацыя сямейнага адпачынку.

Трэба патлумачыць, што адной з асноўных формаў летняй занятасці беларускай дзятвы з'яўляецца адпачынак у аздараўленчых лагерах. Сёлета, напрыклад, аздараўленчыя лагеры розных тыпаў наведаюць 425 тыс. дзяцей, што дазволіць ахапіць аздараўленнем прыкладна 35 працэнтаў дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. А з улікам дзіцячых груп, якія выязджаюць на аздараўленне за мяжу ў рамках гуманітарных аздараўленчых праграм, плануецца павялічыць ахоп аздараўленнем дзяцей і падлеткаў да 40 працэнтаў. У той жа час значная частка дзяцей у летнія месяцы застаюцца не ахопленыя арганізаванымі формамі аздараўлення і большую частку вольнага часу нашы дзеці праводзяць у сваіх гарадскіх дварах. Як арганізаваць іх актыўны адпачынак, чым заняць, якія жвавыя гульні іх могуць зацікавіць? Вось над гэтым і прапануецца падумаць педагагічным работнікам...

Конкурс будзе праводзіцца ў наступных намінацыях: сям'я і лета, лепшы фізкультурна-аздараўленчы праект, лепшы арганізатар (фізкультурнік) дзіцячага адпачынку, лепшы партнёр летняга адпачынку і лепшая публікацыя. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца як педагагічныя работнікі, так і педагагічныя калектывы ўстаноў адукацыі ўсіх тыпаў, спецыялісты па фізічнай культуры і спорце і адпаведныя арганізацыі, а таксама грамадскія арганізацыі.

Першы, рэгіянальны, этап акцыі будзе доўжыцца да 15 верасня. Затым рэгіянальныя камісіі вызначаць па адным пераможцы ў кожнай намінацыі. Яны і стануць удзельнікамі рэспубліканскага этапа акцыі. Матэрыялы канкурсантаў павінны падавацца на суд журы ў друкаваным і электронным варыянце. У якасці дадатку могуць быць пададзены публікацыі, фотаматэрыялы, буклеты, відэаматэрыялы, у тым ліку ў фармаце DVD. Усе матэрыялы павінны суправаджацца тлумачальнай інфармацыяй аб аўтарах праекта, а таксама дадатковымі звесткамі аб асаблівасцях рэалізацыі згаданых мерапрыемстваў. Матэрыялы для рэспубліканскага этапа акцыі павінны быць канцэптуальна абгрунтаваныя і эстэтычна аформленыя. Рэспубліканскі этап пройдзе з 15 верасня па 15 кастрычніка. А вынікі акцыі будуць падведзены на рэспубліканскай нарадзе па пытаннях летняй аздараўленчай кампаніі 2009 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сасіскі і булачкі — галоўныя прадукты ў рацыёне студэнтаў

Як харчуюцца сёння студэнты ВНУ і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў? Гэтым пытаннем зацікавіліся спецыялісты Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Цэнтральнага раёна сталіцы. На тэрыторыі Цэнтральнага раёна Мінска размешчаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, Акадэмія музыкі, Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, вучэбны корпус № 3 Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі, Юрыдычны каледж БДУ і інтэрнат Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Харчаванне студэнтаў і навучэнцаў, як высветлілася, не арганізавана ў вучэбным корпусе Акадэміі мастацтваў і ў Акадэміі музыкі.

Спецыялісты цэнтра гігіены і эпідэміялогіі з задавальненнем канстатуюць, што матэрыяльна-тэхнічная база аб'ектаў грамадскага харчавання ў навучальных установах у апошнія гады паляпшаецца: яны аснашчаюцца сучасным абсталяваннем, там своечасова праводзяцца рамонтныя работы. Найлепшым чынам харчаванне студэнтаў арганізавана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры і ў Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Разам з тым, было ўстаноўлена, што для навучэнскай моладзі не прадугледжана арганізацыя харчавання на льготных умовах, не практыкуюцца датацыі для зніжэння нацэнак прадпрыемствамі грамадскага харчавання і харчавання ў крэдыт.

Увагі заслугоўваюць вынікі праведзенага сярод навучэнскай моладзі анкетавання, у ходзе якога, у прыватнасці, высветлілася, што 19 працэнтаў маладых людзей не маюць ніякага ўяўлення аб асноўных прынцыпах рацыянальнага харчавання, а 3,7 працэнта не лічаць неабходным прытрымлівацца гэтых прынцыпаў. 73 працэнты апытаных паведамілі, што яны знаёмыя з прынцыпамі рацыянальнага харчавання, аднак студэнты не змаглі поўна і дакладна сфармуляваць асноўныя прынцыпы здаровага харчавання. Яшчэ 4,3 працэнта апытаных не змаглі сфармуляваць адказ на пастаўленае пытанне. У ходзе апытання было ўстаноўлена, што ў 90 працэнтаў маладых людзей структура харчавання — незбалансаваная, у большасці з іх асноўны па каларыйнасці і аб'ёме прыём ежы прыпадае на вячэрні час. Трохразовага харчавання прытрымліваюцца толькі 42 працэнты навучэнцаў, 32 працэнты назвалі двухразовы прыём ежы, 6 працэнтаў паведамілі, што харчуюцца чатыры разы на дзень, а 20 працэнтаў паведамілі, што колькасць прыёмаў ежы ў іх розная ў розныя дні. Адным словам, як пашанцуе і ці будуць у іх час і грошы...

Вывучэнне асаблівасцяў харчавання паказала, што ў рацыёне навучэнскай моладзі пераважаюць вугляводзістыя харчовыя прадукты (хлебапрадукты і бульба), у той жа час недастаткова спажываецца мяса, пераважна гэтая група харчавання замяняецца рознымі каўбаснымі вырабамі. Рэгулярна спажываюць кісламалочныя прадукты толькі чацвёртая частка рэспандэнтаў. З малочных прадуктаў спажываецца пераважна натуральнае малако, а спажыванне тварагу, смятаны і сыроў настолькі невялікае, што не з'яўляецца істотным фактарам, які б мог уплываць на нутрыентны склад харчавання. Нізкае спажыванне малочнакіслых прадуктаў у спалучэнні з нізкім узроўнем атрымання клятчаткі і вялікай колькасцю паступлення ў арганізм цукру можа стаць падмуркам для развіцця розных парушэнняў, папярэджваюць медыкі. Аналіз фактычнага харчавання паказаў, што студэнты аднаўляюць энергетычныя патрэбы свайго арганізма пераважна за кошт зерневых і цукразмяшчальных прадуктаў. Гэты стэрэатып харчавання з'яўляецца фактарам, які пагражае развіццём захворванняў страўнікава-кішачнага тракта і метабалічных захворванняў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Страховые полисы «Белкоопстрах» по РБ по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств **серии АЖ № 5789411, 5788860 считать недействительными.**

АДУКАЦЫЯ ад А да Я

Дэпутаты рыхтуюць да разгляду на восеньскай сесіі Кодэкс аб адукацыі, які можа стаць першым дакументам такога роду ў свеце

Мы пачынаем выводзіць кручкі яшчэ ў дзіцячым садку — старанна, высалапіўшы язык. Мы напіхваем даверху падручнікамі новы ранец і паважна шпацыруем у школу. Мы хвалюемся, калі здаём уступныя іспыты. З адукацыяй па жыцці... Не заўсёды атрымліваем ад яе асалоду, часам недаацэньваем яе каштоўнасць, але ўсведамляем важнасць. Уступныя кампаніі штогод становяцца хвалюючай тэмай для абітурыентаў і іх бацькоў, да міністра адукацыі падчас адказаў Ураду заўжды ледзь не больш за ўсё пытанняў, а ў профільнай камісіі Палаты прадстаўнікоў увесь час шмат работы... Асабліва цяпер, калі парламентарыі атрымалі Кодэкс аб адукацыі. Ён такі важкі не толькі таму, што датычыцца фактычна ўсіх грамадзян (бо тут знайшлося месца і для адукацыі дарослых — мы праходзім прафесійную падрыхтоўку і перападрыхтоўку, атрымліваем дадатковую адукацыю, авалодваем новай прафесіяй, а раней гэта галіна заканадаўча не рэгулявалася), але і проста з-за аб'ёмнасці — гэта ж некалькі кіло паперы...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што новага ён абяцае ўдзельнікам навучальнага працэсу, высвятлялі журналісты ў **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзіміра ЗДАНОВІЧА.** Дарэчы, на думку народнага абранніка, з'яўленне Кодэкса апраўданае, бо ў Беларусі нароўні са звыклымі працоўным і крымінальным правам з'явілася новая галіна — права адукацыйнае. У нашай маладой яшчэ краіне назапасілася ўжо неабходная колькасць дакументаў у гэтай сферы. І калі парламентарыі прымуць праект Кодэкса, ён стане першым дакументам такога роду ў свеце, паводле інфармацыі спадара Здановіча, калісьці такая спроба рабілася ў Францыі, аднак прынялі толькі агульную частку, стварыць такі дакумент паспрабавала і Расія — не атрымалася. Цяпер на старце Беларусь: у Агульнай частцы плануецца замацаваць асновы, прапісаць мэты дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы, а ў Асаблівай — зафіксаваць усе нюансы канкрэтна па відах адукацыі, там нарматыўныя палажэнні літаральна зводзяцца да ўзроўню інструкцый.

ТЫЯ, ХТО СЕЕ РАЗУМНАЕ, ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ...

— Першарадную ролю ў адукацыі адыгрывае, вядома ж, настаўнік, — падкрэслівае прафесійны педагог Уладзімір Здановіч, між іншым, заслужаны настаўнік Беларусі, магістр педагогікі. — І нас вельмі хвалявала, як будуць падтрыманы ў Кодэксе настаўнікі, прафесарска-выкладчыцкі склад, ці не будуць зменшаны дакументам іх правы, ці не пагоршыцца іх сацыяльны статус. Мы бачым, што не, наадварот, іх становішча плануецца палепшыць. І калі раней мы проста дэкларавалі, што дзяржаўная палітыка скіраваная на фінансаванне сістэмы адукацыі ў памеры 10 працэнтаў ад ВУП, на дасягненне ўзроўню заробку настаўнікаў у памеры 100 працэнтаў ад заробку прамысловасці і 150 — для прафесарска-выкладчыцкага складу, то ў праекце Кодэкса гэтыя нормы набываюць больш канкрэтнае гучанне.

Разам з тым, узмацніліся і патрабаванні да педагогаў: апроч таго, што нельга будзе працаваць ні ў ВНУ, ні ў школе, ні ў дзіцячым садку чалавеку, які меў судзімасць — няважна, па якім артыкуле, — з прыняццем Кодэкса нельга будзе стаць педагогам яшчэ і тым, хто пазбаўлены бацькоўскіх правоў, нават калі гэта было даўно і яны адноўленыя. У праекце дакумента зафіксавана, што педагагічныя працаўнікі абавязаныя весці здаровы лад жыцця, а таксама праходзіць медагляды не толькі пры паступленні на працу, але і рэгулярна падчас яе.

На думку Уладзіміра Здановіча, было б мэтазгодна ўвесці абавязковы год стажыроўкі для педагога-пачаткоўца — нешта накшталт інтэрнатуры ў медыкаў — усё ж праца настаўніка вельмі сур'ёзная і адказная, ён навучае, выхоўвае, ад яго працы залежыць, якім будзе пакаленне, што прыйдзе нам на змену...

РАНА НЕ ЗНАЧЫЦЬ ДОБРА

— Раней меркавался, што чым раней дзіця пачне навучацца, тым лепш, — кажа суразмоўца. — Аднак новыя даследаванні дэманструюць іншае: тыя, што вельмі рана і актыўна пачалі навучацца, першыя гады ў школе сапраўды паказваюць лепшыя вынікі за сваіх аднагодкаў, аднак недзе да 14 гадоў усё выраўноўваецца, а потым часам назіраецца нават адваротная тэндэнцыя. Таму самае галоўнае ў малодшым узросце — моцнае здароўе, а калі мы загубім здароўе малога яшчэ да школы, загубім яго цікавасць да навучання, то грош цана такім вучэбным поспехам. Асабліва нас хвалююць гэтыя праблемы таму, што паводле праекта Кодэкса, дашкольнае навучанне пачынаецца з 2 месяцаў. Непакоіць нас і норма аб тым, што асноўнай формай адукацыйнага працэсу, паводле праекта, з'яўляецца не толькі гульня, але і занятак. А значыць пойдуць вучэбныя планы, вучэбныя нагрузкі і вынікі, а значыць педагогі будуць патрабаваць іх ад малых... Наконт гэтай нормы мы будзем спрачацца з Міністэрствам адукацыі. Адна справа гульні для развіцця, а зусім іншая — заняткі.

СЯРЭДНЮЮ АДУКАЦЫЮ — УСІМ

Праект Кодэкса заканадаўча замацоўвае, што ў Беларусі здзяйсняецца пераход да абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі (нагадаем, што сёння ўсеагульнай з'яўляецца толькі базавая ступень). Чым гэта выклікана?

— Калі так паглядзець, то амаль кожны грамадзянін сёння і так атрымлівае сярэднюю адукацыю. У розных формах — ці то 11 класаў у школе, ці то 9 класаў, а потым у ПТВ ці каледжы набірае тую ж самую сярэднюю адукацыю. Аднак узнікла асцярога, што ўсю агульную сярэднюю адукацыю будуць атрымліваць толькі ў школах. Таму пакуль такую строгую норму не запісалі, аднак у Кодэксе ўжо прапісаны больш выразна (як адна з асноў дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы) пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Гэты працэс, натуральна, будзе ісці паступова.

У праекце дакумента дакладна азначаныя правы і абавязкі школьнікаў. З новага там — прынцып адраснасці сацыяльнай абароны: скажам, плата за падручнікі будзе дыферэнцыявацца ў залежнасці ад матэрыяльнага становішча сям'і, віду ўстановы ды іншых фактараў. Паклапаціліся і пра тое, каб дзецям у сельскай мясцовасці было прасцей дабірацца на вучобу. У праекце Кодэкса прапісана, што яны могуць бясплатна карыстацца маршруткамі, прыгараднымі, міжгароднімі аўтобусамі і мясцовымі цягнікамі.

Школьнікаў могуць выключыць не раней за 10—11 класы (з 1 па 9 толькі ў выпадку правапарушэнняў, цяжкія падлеткі навучаюцца ў спецустановах) за сістэматычныя парушэнні дысцыпліны, непаспяховасць па трох прадметах.

— Аднак тут узнікае пытанне, што лічыць непаспяховасцю — аднаку ў 1 бал? Але гэта таксама станоўчы вынік — не нуль жа... Тут варта канкрэтызаваць, — адзначае парламентарый, а гэта значыць, што пытанне будзе пастаўлена перад распраоўшчыкам.

Школа для адораных дзяцей на Віцебшчыне вельмі добра сябе паказала, і цяпер прынята рашэнне стварыць такія ў кожнай вобласці. Яно ў будучыні знойдзе адлюстраванне і ў праекце Кодэкса.

МУЧАНІКІ НАВУКІ

Выразна прапісаныя ў дакументе правы і абавязкі студэнтаў, а таксама робіцца поўны пералік матэрыяльных заахвочванняў мучанікаў навукі. Прадугледжана сем відаў стыпендый, у тым ліку імянная і персанальная.

У айчынных ВНУ налічваецца каля 450 тыс. студэнтаў, штогод недзе 14—16 тыс. адлічаецца. І падставы для гэтага рэгламентуюцца заканадаўча. Пазбавіцца студэнцкага білета можна за акадэмічную запазычанасць, няяўку на экзамен і пропуск больш як 10 дзён заняткаў без уважлівай прычыны, сістэматычнае парушэнне дысцыпліны, нявыплаты за вучобу. Аднак ёсць і добрыя навіны — для студэнтаў пашырыліся ўмовы атрымання акадэмічнага адпачынку: апроч хваробаў і траўмаў падставай для часовага (максімум год) спачыну ад вучобы можа стаць зніжэнне працаздольнасці, а таксама любая іншая ўважлівая прычына па дамоўленасці з кіраўніцтвам ВНУ.

Строга лімітавалі распрацоўшчыкі Кодэкса і магчымае аднаўленне.

— Здаралася, што з просьбай аб аднаўленні звярталіся людзі, якія кінулі вучобу 15—20 гадоў таму, — дзеліцца сваім досведам Уладзімір Здановіч. — Раней адпаведных нормаў у заканадаўстве не было і гэта пакідалася на меркаванне рэктара, а цяпер прапісаны канкрэтны тэрмін — не больш за 3 гады.

У прапанаваным на разгляд дэпутатам варыянце Кодэкса замацоўваецца таксама, што статусам універсітэта або акадэміі могуць валодаць толькі ўстановы дзяржаўнай формы ўласнасці.

— Гэта звязана з тым, што атрыманне адукацыі ў ВНУ дзяржаўнай формы ўласнасці адбываецца на якасна больш высокім узроўні, і гэта не навіна, — тлумачыць Уладзімір Здановіч.

РЭЛІГІЙНАСЦЬ, ЭКАЛАГІЧНАСЦЬ І АПАЛІТЫЧНАСЦЬ

Экалагічная накіраванасць адукацыі замацоўваецца ў праекце заканадаўчага акта. «Калі раней у нас была задача пакарыць прыроду, цяпер прыйшлі да высновы, што гэта ідэя разбуральная», — заўважае дэпутат. Сапраўды, у многіх заходніх краінах спецыялісты па менеджменце навакольнага асяроддзя ёсць практычна ў кожнай буйной арганізацыі, а адпаведная спецыяльнасць у навучальных установах карыстаецца попытам.

Намеціліся і новыя акцэнты ў стаўленні да адвечнага канфлікту навукі і рэлігіі:

— Мы не будзем рабіць спробу ператварыць свецкую адукацыю ў рэлігійную, тым не менш некаторыя крокі, якія мы лічым карыснымі для нашай моладзі, мы ўсё ж такі будзем старацца зрабіць. І ў першую чаргу гэта ўвядзенне ў навучальных установах асобнага курсу (або ўкрапін у іншыя курсы), які будзе распавядаць пра дзейнасць дэструктыўных сектаў. Каб маладыя людзі не апынуліся ў разгубленасці, калі сутыкнуцца з іх дзейнасцю, ведалі, якую ролю яны адыгрываюць, і як сябе паводзіць. Думаю, гэта будзе карысна.

У нас не забараняецца дзейнасць рэлігійных устаноў, работа з выхаванцамі па-за навучальнымі ўстановамі. А вось дзейнасць рэлігійных арганізацый непасрэдна ў навучальных установах забароненая, як і палітычных:

— Палітыка насаджацца не будзе, — запэўнівае парламентарый, — норма, якая забараняе дзейнасць у навучальных установах палітычных партый і грамадскіх арганізацый, што праследуюць палітычныя мэты, застаецца.

Паводле праекта Кодэкса развіцё сістэмы адукацыі будзе ісці ў першую чаргу за кошт дзяржаўнага бюджэту. Хоць дапушчальныя і іншыя метады фінансавання, якія не забароненыя ў нашай дзяржаве: і за кошт самастойнага зарабляння грошай навучальнымі ўстановамі, і за кошт спонсарскай дапамогі ды іншае.

РАЗМЕРКАВАННЕ: АД РЭПРЭСІЎНАСЦІ ДА ДАГАВОРНАСЦІ

Заўжды балючым пытаннем для выпускнікоў становіцца размеркаванне. Асабліва для тых, хто большую частку навучання быў студэнтам платнай формы, а скажам на апошнім, 5-м курсе, пачаў нарэшце за выдатныя поспехі не толькі не плаціць за вучобу, але і атрымліваць стыпендыю. Былі, праўда, і адваротныя выпадкі, калі бюджэтнікам удавалася перавесціся на платную форму напрыканцы навучання. Цяпер гэткіх несправядлівасцяў не будзе. У Кодэксе дакладна прапісана: калі палова і больш тэрміну навучання былі за сродкі бюджэту, то выпускнік падлягае размеркаванню, калі менш за палову, то не.

Ліквідаваны нарэшце нонсэнс па паўторным размеркаванні: былі выпадкі, калі выпускнік ПТВ адпрацоўваў па размеркаванні, а пасля паступаў у ВНУ, і скончыўшы яе, «аддаваў пазыку» дзяржаве яшчэ два гады... Цяпер папярэдняе размеркаванне будзе залічана.

— Вялікае значэнне, на мой погляд, будзе мець пераход ва ўсіх навучальных установах, якія забяспечваюць атрыманне прафесіі, да падрыхтоўкі спецыялістаў па дагаворах (гэта датычыцца каледжаў, ПТВ, ВНУ), — адзначае кіраўнік Пастаяннай камісіі. — З навучэнцамі будуць заключацца дагаворы на падрыхтоўку, дзе будуць указаны істотныя ўмовы: падрыхтоўка будзе весціся за плату ці за бюджэтныя сродкі, тэрмін і ўмовы размеркавання. Каб маладыя чалавек, пачынаючы вучобу, уяўляў, чым будзе займацца, які лёс яго чакае ў найбліжэйшыя гады пасля заканчэння навучальнай установы. Нямногія сённяшнія абітурыенты ўяўляюць свой далейшы лёс — абы паступіць. Хацелася б, каб гэта было больш мэтанакіравана.

Само па сабе размеркаванне з часам адамрэ — перакананы палітык:

— Гэта мера, якая неабходна на сучасным этапе развіцця грамадства. Ніхто з нас не хацеў бы, каб Беларусь ператварылася ў адзін квітнеючы горад Мінск. Трэба ж падымаць усе ўскраіны, каб уся Беларусь была прыгожай і моцнай. А для гэтага трэба, каб там працавалі людзі. Мы паступова пераходзім ад рэпрэсіўнай формы размеркавання да дагаворнай: дзяржава са свайго боку абяцае размеркаванаму льготныя крэдыты, даплаты, службовае жыллё.

Праект Кодэкса аб адукацыі зараз знаходзіцца на разглядзе ва ўсіх пастаянных камісіях ніжняй палаты парламента. Калі канцэптуальных заўваг не будзе, то ў Авальнай зале ён можа «загучаць» ужо ўвосень. А вось за падрыхтоўкай да другога чытання часу можа прайсці куды больш, мяркуе Уладзімір Здановіч. Работы і сапраўды шмат: і з-за аб'ёму Кодэкса, і з-за маштабнасці і цікавасці да самой галіны, і з-за таго, што дакумент па сутнасці беспрэцэдэнтны. Яшчэ раз падкрэслім, што ўсе апісаныя новаўвядзенні — пакуль толькі праект. І верагодна, яго чакае яшчэ вельмі доўгае і актыўнае абмеркаванне, у якім вы таксама можаце ўзяць удзел.

Ала МАЧАЛАВА.

ПАД ВЯСЁЛКАВАЙ ДУГОЙ

Вы ведаеце, дзе можна знайсці лепшых дзяцей Беларусі? Будучых знакамітасцяў, дзеячаў культуры, навукі, палітыкаў, кіраўнікоў? У «Зубраняці». На працягу ўсяго года тут навучаюцца, выхоўваюцца і папраўляюць здароўе хлопчыкі і дзяўчаткі, якія ўжо змаглі заявіць пра сябе, але пасля жыцця ў гэтым лагеры, яны здольныя дасягаць большых вышынь.

Па прынцыпе засолкі агуркоў

У 1969 годзе «Зубраня» стваралася як лагер для юных лідараў — актывістаў піянерскай і камсамольскай арганізацый, але і сёння сюды прыязджаюць лепшыя з лепшых. Юныя пажарныя, кадэты, лідары грамадскіх арганізацый, выдатнікі вучобы, творчыя асобы. На базе лагера праводзіцца фестываль «Юныя таленты Беларусі», калі на працягу года ў лагеры паспяваюць пабываць сябе больш за тысячу малых творцаў, дзейнічаюць змены вакалістаў, танцораў, паэтаў, фальклорных калектываў, тэатраў моды, юнкораў. Для дзяцей праводзяць майстар-класы дарослыя майстры сцэны, члены творчых саюзаў, беларускія зоркі эстрады.

Дырэктар нацыянальнага дзіцячага аздараўленчага лагера Надзея АНДРЭЕВА любіць прыводзіць такі прыклад: «Кожная гаспадыня ведае сакрэт засолкі агуркоў. Трэба іх заліць расолам, а далей, як ні круці, яны ўсё адно прасоляцца. Так і ў працы з дзецьмі: неабходна аб'яднаць адораных, таленавітых у нейкай галіне дзяцей разам, сабраць для іх выдатны калектыў педагогаў, запрасіць прадстаўнікоў грамадскасці, якія ўжо нечага дасягнулі ў жыцці. І будзе вынік». І сапраўды, любое дзіця, што трапляе сюды, пагружаецца ў незвычайнае творчае асяроддзе, кожны дзень насычаны рознымі падзеямі, што няма часу нават, каб проста пасядзець. Бывае, што дзецям і складана выбраць, якому занятку аддаць перавагу. Тут заўсёды віруе жыццё, па лагеры сноўдаюць дзеці ў касцюмах — ідзе падрыхтоўка да чарговага свята, конкурсу. А напярэдзе яшчэ гульні, фестывалі, экскурсіі, спаборніцтвы, паходы, тут праходзіць нават «Еўрабачанне па-зубраняцку» і танцы з факеламі. Нездарма «Зубраня» называюць «краінай, дзе нараджаецца вясёлка».

Дзе яшчэ дзеці змогуць так праявіцца, паспрабаваць сябе ў розных ролях і набыць столькі сяброў (бо спецыяльныя гульні і конкурсы працуюць на тое, каб з'яднаць хлопчыкаў і дзяўчатак)? У рэшце рэшт, гэта загадкавае месца — амаль на кожны Дзень народзінаў лагера, а ён святкуецца 17 жніўня, — у небе пераліваецца сапраўдная вясёлка.

Дагары нагамі

Мы ў лясной гасцёўні. У «Зубраняці» ціхая гадзіна, а дзеці гушкаюцца дагары нагамі ў гамаках. Хто хоча, будзе спаць, хто не — могуць збіраць ягады, ці весці размовы з педагогам. Але дзецям і не ўцяміць, што тут з імі праводзіць заняткі псіхолаг.

Пытаюся ў масквічкі Алены Фраловай, што сядзіць у адным з гамакоў: «Ну, дзе лепш, у расійскіх летніках, ці тут?»

— Безумоўна, у «Зубраняці»! Тут прыгажэй, чарніц многа. Праграма добрая, гульні актыўныя-пазітыўныя, я на коніку каталася і на экскурсію ездзіла. У праграме яшчэ і водныя, і веласіпедныя паходы, паход начны з палаткай, катанне на катарах і катамаранах і шмат чаго іншага.

— З лепшымі дзецьмі павінны працаваць творчыя, інтэлектуальна-развітыя, высокаморальныя педагогі, — заўважае Надзея Ануфрыева. — Зразумела, нам даводзіцца мяняць падыходы ў працы з дзецьмі. Цяпер вырасла больш дасведчанае пакаленне, яно ведае, што мала проста ўмець чытаць і лічыць, а трэба валодаць камп'ютарам і замежнымі мовамі. Вырасла пакаленне, якое хоча зручнасцяў, у нас растуць затраты, бо дзеці прымаюць душ па два разы на дзень. Сёння не трэба ім гаварыць, што неабходна мыць рукі перад ядой, але даводзіцца больш увагі надаваць прапагандзе здаровага ладу жыцця, весці работу па праблемах курэння. Вырасла пакаленне, якое ведае свае правы, і з ім ужо трэба лічыцца».

Тут быў Вася

Але нязменнымі застануцца многія легенды і традыцыі «Зубраняці». Гэта край, поўны цудаў. Тут можна загадваць жаданні, і, кажуць, яны абавязкова спраўджваюцца. Напрыклад, у «Зубраняці» расце бярозка з адбіткам дзіцячай далоні на ствале, да якога дзеці імкнуцца дакрануцца на шчасце. У алеі вобразаў можна пакідаць дурныя думкі і ўсё дрэннае, што вам перашкаджае, альбо наадварот дзяліцца сваёй дабрынёй, трэба толькі абняць дрэвы. Сярод рытуалаў «Зубраняці» — у першыя дні знаходжання ў лагеры ісці да возера Нарач і далонямі дакранацца да вады, калі знайсці на беразе каменьчык, ракушку ці галінку, і захоўваць усю змену, час у лагеры пройдзе найбольш цікава і перамогі будуць забяспечаны ва ўсіх спаборніцтвах.

У лагеры нават ёсць камень «Тут быў Вася», калі рукі свярбяць, на ім можна пакінуць свой аўтограф. Камень гэты з кожным годам расце — ад усё новых слаёў фарбы, што закрываюць старыя надпісы.

А пажыць за год у «Зубраняці» паспяваюць каля 13 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак. У «школьны» час за змену тут адпачывае каля 750 дзяцей, а летам пад тысячу (і гэта не благая лічба, для параўнання ў тым жа «Арляняці» ўзімку — 800, летам — каля 2 тысяч).

Наогул жа за ўвесь час існавання лагера стаць «зубранятамі» змаглі 400 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак. Многія з іх ужо маюць сваіх дзяцей, а хтосьці і ўнукаў. Але, 17 жніўня, калі будзе святкавацца 40-гадовы юбілей лагера, тут будуць рады сустрэць усіх, чый лёс быў звязаны з «Зубранём». А тут выраслі не толькі пакаленні дзяцей, але і пакаленні педагогаў (многія з іх пачыналі сваю кар'еру з тутэйшых важатых). У праграме святкавання — «круглы стол», канцэрты, феерверк і, вядома ж, знаёмства з самім лагерам. Так, менавіта знаёмства, «Зубраня» пастаянна мяняецца. Нават той, хто не быў тут усяго апошнія пяць гадоў, не пазнае лагер.

Краіна дзяцінства

— Мы не сядзім на шыі ў дзяржавы. Платныя паслугі — рэпетытарскія, заняткі ў камп'ютарнай зале, дазвол карыстацца басейнам іншым арганізацыям, гандлёвыя пункты (у нас ёсць кавярня і карчма, дзе мы прадаём бліны, піцу, гарачы шакалад), турыстычная дзейнасць, — дазваляюць нам здабываць грошы на далейшае развіццё лагера, — заўважае дырэктар «Зубраняці».

Дарэчы, сярод экскурсій, якія праходзяць у лагеры, дзецям асабліва падабаюцца інтэрактыўныя — калі можна не толькі слухаць і назіраць, але і ўдзельнічаць «у працэсе». Так, дзеці, што выпраўляюцца «дарогамі мужнасці», пераапранаюцца ў салдацкую вопратку і як сапраўдныя байцы прабіраюцца да аб'ектаў Першай і Другой сусветных войнаў. Дзесьці ім трэба красціся, дзесьці бегчы, не абыходзіцца і без прывалу, і піцця вады з салдацкай пляшкі. На іншай экскурсіі дзятва апранае нацыянальную вопратку, спрабуе сябе за ткацкім станком, дзеці глядзяць, як па старажытным рэцэпце выпякаецца хлеб. Дарэчы, у «Зубраняці» ёсць свой хутар — ён пабудаваны на тэрыторыі лагера, тут дзяцей сустракаюць сапраўдныя гаспадар і гаспадыня ў нацыянальнай вопратцы, у хаце вісяць старажытныя прадметы сялянскага побыту, а ў карчме можна паласавацца блінамі. Дарэчы, у хутары ёсць і міні-гасцініца і тут гатовы прымаць турыстаў.

Гуляць па «Зубраняці», што ў казку трапіць — тут шмат кветак і

СТУДЭНЦКІ СЕЗОН МОЖНА ЛІЧЫЦЬ АДКРЫТЫМ

Яшчэ тыдзень-два і пачнецца так званы «студэнцкі сезон», час, калі ў сталіцу пачынаюць з'язджацца аматары разнастайных навуковых дысцыплін, універсітэцкіх заняткаў і гадзін, праведзеных у чытальных залах. І асноўная праблема, з якой ім давядзецца сутыкнуцца, — жыллёвая, паколькі інтэрнатаў, па асноўным законе невязення, на ўсіх не хапае, а жыць недзе трэба. Вось і адпраўляюцца яны на пошукі здымнага жылля, якое, дарэчы, не такое таннае. Калі б студэнты разлічвалі на сваю стыпендыю, то жыць ім давялося б на лавачках у парках ці вакзале. Таму асноўны галаўны боль па забеспячэнні ўсіх матэрыяльных затрат звальваецца на бацькоўскія плечы. Толькі зрэдку студэнт, якому пашанцавала ўладкавацца на працу, можа забяспечыць сябе сам.

Сума, якую даводзіцца аддаць на аплату жылля вагаецца ў сярэднім дзесьці ад 200 да 350 долараў у залежнасці ад раёна, колькасці пакояў, з гаспадыняй ці без яе, а таксама колькасці здымшчыкаў. Плюс да аплаты кожны месяц даводзіцца камунальныя плацяжы. Гэта ў сярэднім 50—60 тысяч беларускіх рублёў. Часцей студэнты аддаюць перавагу двухпакаёвым кватэрам, дзе можа спакойна размясціцца чатыры чалавекі і, вядома ж, без гаспадыні. Атрымліваецца своеасаблівы інтэрнат, толькі на меншую колькасць жыльцоў. Важную ролю адыгрывае месцазнаходжанне кватэры, а таксама яе аддаленасць ад навучальнай установы ці, на крайні выпадак, ад станцыі метро. Напрыклад, у мікрараёне «Чыжоўка» аднапакаёвая кватэра ў сярэднім абыходзіцца ў 180 долараў без камуналкі, а ў Цэнтральным — да 200. Цана двухпакаёвай кватэры ў Савецкім раёне вагаецца ад 250 да 300 долараў ЗША ў залежнасці ад умоў пражывання. Здараюцца выпадкі, што тая плошча, якая здаецца, не прызначаная для жыцця наогул, там нават тараканы адмаўляюцца паказвацца. Але цану гаспадары скідваць не хочуць.

Як варыянт для бяздомнага студэнта існуе падсяленне. На сёння гэта дзесьці долараў 80—90. Але тут галоўнай небяспечнасцю з'яўляецца тое, што невядома з кім даводзецца жыць, ды яшчэ і трываць гаспадыню ў сябе пад носам кожны дзень, якая далёка не заўсёды добрая і ласкавая. Паслугу падсялення ці засялення робяць многія агенцтвы, якіх цяпер такая неймаверная колькасць, што часам праблема ў выбары менавіта таго самага неабходнага, паколькі прыгожая рэклама — гэта яшчэ далёка не паказчык высокага прафесіяналізму. Ды і паслугі іх не такія ўжо танныя: мінімум 180 тысяч беларускіх рублёў — максімум 360. А дзе знайсці студэнту такую суму, калі сітуацыя з засяленнем амаль што на катастрафічнай ступені?! Даводзіцца думаць, шукаць выйсце. Агенцтва — гэта крайні выпадак, а часцей на дапамогу прыходзяць інтэрнэт, газеты з аб'явамі і знаёмыя, знаёмыя знаёмых і гэтак далей.

Алена Маласай, студэнтка БДПУ імя Максіма Танка, шукала новае месца жыхарства амаль месяц. Чаму новае? Здарылася так, што на старым у яе і сябровак, якія жылі разам з ёй, не склаліся добрыя адносіны з гаспадыняй. Дзяўчаты цярпелі многае: гасцей, якія наведваліся амаль што кожны дзень да дачкі ці сына гаспадыні; камуналку, якая за кошт шматлікіх наведвальнікаў утварылася на кухні, у ваннай, ды і наогул паўсюль; высокую цану за сваё пражыванне (дзяўчатам падабаўся той раён, дзе яны жылі)... Але апошняй кропкай ва ўзаемаадносінах сталі грошы, якія іх хацела заставіць заплаціць гаспадыня як быццам за камунальныя паслугі, якія дзяўчаты ўжо даўно аплацілі.

— Яна думала, што мы проста сцерпім, прамаўчым, паколькі нам няма куды падзецца, і заплацім гэтыя грошыкі. Такім чынам гаспадыня вырашыла падпрацаваць на нас. А на той момант ёй былі неабходны грошы, якія знайсці яна магла толькі такім чынам. Камунальныя плацяжы ў нас наогул былі заўсёды надта вялікія, а тут яшчэ і гэтая даплата. Вось таму і давялося нам памяняць месца жыхарства, якое мы шукалі даволі доўга. Здаецца, сярэдзіна лета, студэнтаў няма, цана павінна быць мінімальнай. Але не. Нам давялося аббегаць амаль што ўвесь горад, і паўсюль мы чулі адну суму — 300 долараў, ды яшчэ і камуналка ў прыдачу. І, чамусьці, як толькі гаспадары чулі, што мы — студэнткі і жыць нас будзе чатыры чалавекі (дзяўчаты шукалі двухпакаёвую кватэру), то адразу змянялі сваё стаўленне да нас, ці наогул адмаўлялі. І, здавалася б выбару павінна быць шмат. Але. На адных газетах, тэлефонных званках і інтэрнэце мы затрацілі больш, чым нам давялося заплаціць у агенцтве, якое, дарэчы, вельмі дапамагло. Дзякуючы яму мы знайшлі кватэру ў добрым раёне, недалёка ад метро і ад універсітэта, і даволі танна. Прычым кватэра толькі нядаўна адрамантаваная, з новай кухняй, тэлевізарам, шклопакетамі. Так што пасля такога паспяховага варыянту мы змянілі наша памылковае меркаванне наконт агенцтваў.

Алена прызнаецца, што ёй давалі месца ў інтэрнаце, але яна ад яго адмовілася, паколькі жыць на кватэры ёй падабаецца больш. Тут утульна, камфортна. Таму дзяўчына і гатова змагацца з матэрыяльнамі праблемамі дзеля жыцця на кватэры, дзе, як кажа яна, адчуваеш сябе як дома.

Аляксей Марозаў, студэнт БДУ, таксама не надта задаволены сваім сённяшнім месцам жыхарства і падумвае аб пераездзе. Раён у прынцыпе прымальны, кватэра знаходзіцца недалёка ад Партызанскага праспекта і да фабрыкі «Камунарка» рукой падаць, а станцыя метро дык і наогул амаль што каля самага пад'езда. У гэтым сэнсе пашанцавала. Але кошт кватэры прымушае задумацца над ідэяй далейшага ў ёй пражывання.

— Кватэру двухпакаёвай назваць цяжка. Гэта, хутчэй, паўтара пакоя з маленькай кухняй і ваннай. Жыве нас тут два чалавекі, а плаціць даводзіцца 330 долараў плюс 100—180 тысяч камуналкі, якая, праўда, разлічваецца ў залежнасці ад пары года. Зімой яна складае 180 тысяч, летам 120. Дарагавата атрымліваецца. Проста шкада аддаваць амаль што палову заробка на аплату кватэры. Мне пашанцавала ў тым плане, што я працую і магу сябе забяспечыць сам, але ўсё адно грошай шкада. Таму і шукаю найбольш прымальны варыянт. Цяпер пачакаю пакуль адыдзе «студэнцкі сезон» і пачну пошукі нечага новага.

Так, цяпер знайсці жыллё па нізкай цане будзе даволі складана. Добра студэнтам старэйшых курсаў, якія ўжо не адзін год жывуць на здымнай кватэры. Іх месца застаецца за імі год за годам. Складаней будзе першакурснікам, якія толькі-толькі прыехалі, уварваліся ў сталічнае жыццё. Пошукі кватэры — гэта першая цяжкасць, з якой ім давядзецца сутыкнуцца.

Юлія Андрэеўна здае кватэру ўжо каля чатырох гадоў. Пенсія невялікая, а хочацца папамагчы дачцэ і ўнукам. Жанчына шчыра прызнаецца, што спачатку не хацела браць кватарантамі студэнтаў. Думалася, што будуць толькі п'янкі і гулянкі, а потым праблемы з суседзямі. Таму і вырашыла напачатку здаць кватэру сямейным людзям, якія ў хуткім часе з'ехалі, атрымаўшы месца ў інтэрнаце ад арганізацыі, у якой працуюць. Падумала, падумала Юлія Андрэеўна і вырашыла ўзяць на кватэру студэнтаў. І ў выніку засталася задаволеная: плацяць своечасова, чысціня і парадак заўсёды, а пра цішыню дык і пытанняў няма.

— Ужо два гады жывуць у мяне гэтыя студэнцікі і, дзякуй Богу, усё добра. Зараз нават плату ім падымаць не буду. Яны мне як плацілі па 70 долараў на чалавека, так і будуць плаціць далей. Ім і так складана, і я іх разумею. Кватэра двухпакаёвая, але я з імі не жыву, паколькі сама ведаю, што гэта такое — жыць з гаспадыняй. Іх там і так чацвёра. За кватэру не хвалююся. Давярай, як кажуць, але правярай. На пачатку засялення мы з імі заключылі праз агенцтва дагавор, у якім абгаворваюцца ўсе правілы і абавязкі абодвух бакоў. Так што хвалявацца няма чаго.

Дагавор аб найме — гэта даволі выгадныя ўмовы і для здымшчыка, і для таго, хто кватэру здае. У гэтай паперы абгаворваюцца ўсе матэрыяльныя і юрыдычныя бакі жыллёвага пытання. Праўда, самому гэтым займацца будзе даволі складана. Таму і даводзіцца плаціць яшчэ і за паслугі агенцтва, якое даволі прафесійна разбіраецца ва ўсіх пытаннях.

У пытаннях жылля разбіралася студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Ведай нашых!

«МЕДАЛЬНЫ ЗВОН»

Ліпень прайшоў для беларускіх школьнікаў, якія бралі ўдзел у міжнародных школьных алімпіядах па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі, надзвычай паспяхова. З Германіі, якая прымала ў гэтым годзе 50-ю юбілейную міжнародную матэматычную алімпіяду, нашы вучні прывезлі адзін залаты, чатыры сярэбраныя і адзін бронзавы медалі. Залатой узнагародай можа пахваліцца выпускнік Ліцэя БДУ Арцём Тоесцеў. Сярэбранымі — выпускніца віцебскай гімназіі № 8 Святлана Аўчыннікава, выпускнік сталічнай гімназіі № 29 Аляксей Вайдзялевіч, вучаніца сярэдняй школы № 41 горада Мінска Паліна Худзякова і вучань віцебскай гімназіі № 8 Сяргей Даўгаль. А бронзавы медаль заваяваў выпускнік рэчыцкай гімназіі №1 Арцём Говараў. Усяго ўдзел у алімпіядзе ўзялі школьнікі са 104 краін свету.

Выніковай стала і паездка беларускіх школьнікаў у Мексіку, дзе праходзіла міжнародная алімпіяда па фізіцы. Усе пяцёра ўдзельнікаў нацыянальнай зборнай вярнуліся дадому з медалямі. Сярэбранымі медалістамі сталі Максім Горлач (Ліцэй БДУ), Ігар Каргін (барысаўская гімназія № 1) і Антон Дашкевіч (гімназія № 29 горада Мінска) . Бронзавымі медалямі былі ўзнагароджаны Ганна Міцькавец (Ліцэй БДУ) і Міхаіл Гушчын (Магілёўскі абласны ліцэй № 1). А сапраўднай сенсацыяй фізічнай алімпіяды стала абсалютная перамога на ёй дзяўчыны — маленькай кітаянкі, дарэчы, першая за 40-гадовую гісторыю правядзення алімпіяды.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.33	20.56	15.23
Віцебск —	5.18	20.51	15.33
Магілёў —	5.23	20.46	15.23
Гомель —	5.26	20.37	15.11
Брэст —	5.49	21.10	15.21
Гродна —	5.56	21.05	15.09

Месяц

Поўня 6 жніўня.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Алімпіяды, Ганны, Іраіды, Аляксандра.*

К. *Дароты, Клаўдзіі, Кандрата.*

Фота Валерыя КАВАЛЁНКА..

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +23..+25°C	КІЕЎ +20..+22°C	РЫГА +22..+24°C
ВІЛЬНЮС +22..+24°C	МАСКВА +15..+17°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +21..+23°C

Інфарм-укол

ЖАВАЛЬНЫ ТЫТУНЬ І РАК

З-за новых правілаў аб забароне курэння на працоўным і ў грамадскіх месцах у многіх краінах замацавалася тэндэнцыя да выкарыстання жавальнага тытуню. Тытунёвыя кампаніі хоць і прыдумалі тэрмін бяздымнага тытуню, аднак гэта не азначае, што ён менш шкодны за цыгарэты.

Жавальны тытунь выклікае залежнасць ад нікаціну гэткую ж моцную, як марфін ці какаін. Пры яго ўжыванні чалавек паглынае адразу некалькі таксічных агентаў, многія з якіх канцэрагены. Напрыклад:

- Нітразамін. Самы моцнадзейны з усіх вядомых канцэрагенаў.
- Палоній. Радыеактыўны элемент.
- Фармальдэгід. Хімікат, які выкарыстоўваецца ў бальзамуючым складзе.
- Мыш'як і кадмій. Атрутныя металы.

Роўна праз тыдзень як вы пачняце жаваць тытунь, у ротавай поласці могуць з'явіцца маленькія белыя плямы, якія называюцца лейкаплакія, і па сутнасці бываюць першымі прыкметамі раку. Чырвоныя плямы, эрытралейкаплакія, яшчэ часцей становяцца ракавымі.

Акрамя аральнага раку жавальны тытунь павялічвае рызыку з'яўлення захворванняў зубоў і дзяснаў, сардэчна-сасудзістай сістэмы, раку страваводa, горла, гартані, страўніка, падстраўнікавай залозы і прастаты.

ВЫ ЯБЛЫК ЦІ ГРУША?

Калі вы пакутуеце ад лішняй вагі, паспрабуйце зразумець, у якіх менавіта месцах пераважна адкладаецца тлушч у вашым целе.

Гэта дапаможа прыблізна ацаніць рызыку ўзнікнення абумоўленых атлусценнем хваробаў. Калі лішак вагі сканцэнтраваны ў вобласці жывата, што надае вам падабенства з яблыкам, то рызыка можа быць вышэйшая, чым калі тлушч засяроджаны галоўным чынам у вобласці сцёгнаў, што надае вам падабенства з грушай.

Каб высветліць, хто вы — яблык ці груша, памерайце акружнасць у поясе на ўзроўні крыху вышэй за тазавыя косці і акружнасць сцёгнаў у самым тоўстым участку ягадзіц. Цяпер падзяліце акружнасць таліі на акружнасць сцягна. Калі суадносіны перавышаюць у мужчын 0,95, а ў жанчын 0,80, то вы, хутчэй, набліжаецеся формай да яблыка.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

КЁКУСІНКАЙ, або Моц рэальнага каратэ

Укожнага на слыху слова «каратэ». Адразу ўзнікаюць перад вачыма кадры вядомых кінафільмаў, знакамітыя вобразы «майстроў Шао Ліня»... Ёсць і такія, для каго гэтае слова мае іншы сэнс і хто ўспрымае каратэ як арганізаваную бойку.
Але ці ведаем мы, што насамрэч стаіць за гэтым словам і што адбываецца ў сценах спартыўнай залы падчас трэніроўкі?

Каб прыадчыніць завесу таямнічасці, я сустрэлася з трэнерам каратэ кёкусенкай **Арцёмам Бортнікам** і яго падапечнымі **Дар'яй Лянковай, Марыяй Емяльянавай, Багданам Цімашэвічам,** братамі **Раманам і Ігарам Марозавымі, Аляксеем Кароткіным.** Усе яны займаюцца ў спартыўным клубе «Кайман» і маюць поспехі не толькі на раённых спаборніцтвах, але і на рэспубліканскіх.

— Арцём, раскажы, калі ласка, калі і як ты прыйшоў у каратэ і чаму менавіта гэты напрамак выбраў?

— Яшчэ ў дзяцінстве я ўпрасіў бацькоў дазволіць мне займацца ўсходнімі адзінаборствамі. Яны вельмі працівіліся майму выбару. Але ж мая прыродная ўпартасць перамагла. Кёкусенкай я пачаў займацца ў 12 гадоў. Мой трэнер Р. Гурыновіч разам з бацькамі далі той штуршок, які дапамог выбраць жыццёвы напрамак — самому быць трэнерам.

— Сёння ты працягваеш трэніравацца, удзельнічаць у спаборніцтвах рознага ўзроўню і пры гэтым сам з'яўляешся трэнерам. Ці хапае на ўсё часу?

— Хапае *(усміхаецца)*. Цяпер у мяне займаюцца дзеці і дарослыя ў шасці ўзроставых катэгорыях. Самым малодшым шэсць гадоў. А ёсць і тыя, каму за трыццаць. Трэніроўкі не менш чым пяць разоў на тыдзень, прычым амаль цэлыдзень. Калі трэнірую сваіх вучняў, трэніруюся і сам. Мы вучымся адно ў аднаго. У зале кожны бярэ тое, чаго яму не хапае: нехта моц фізічную, нехта цвёрдасць духу, іншыя вучацца цярпенню і ўважлівасці.

— Арцём, такія розныя ў цябе вучні. А ці патрэбна нейкая падрыхтоўка, перш чым пачаць займацца кёкусенкай? Няўжо любы чалавек можа прыйсці ў групу адпаведнага ўзросту і пачаць трэніравацца?

— І так, і не. Прыйсці можа кожны. Але калі прыходзіць чалавек зусім непадрыхтаваны, правільна рабіць элементы ці вядзенне бою ў яго не атрымаецца. Для дарослых і дзяцей існуюць агульныя правілы — шмат часу аддаецца агульнай фізічнай падрыхтоўцы, а не баям. Больш вопытныя вучні заўсёды дапамагаюць навічкам незалежна ад узросту.

— Бачу, у цябе займаюцца і дзяўчаты. Ці жаночая гэта справа?

— А чаму ж не? Напрыклад, Даша Лянкова — шматразовая чэмпіёнка Беларусі па версіі ката.

Размову працягваем з дзяўчынай.

— Даша, ты выглядаеш вельмі па-дзявочаму мяккай і пяшчотнай. Як такі вобраз спалучаецца з духам байца і такім жорсткім відам адзінаборстваў?

— Кёкусенкай пры ўсёй жорсткасці дае магчымасць развіць мець навіта жаночыя рысы — пластыку рухаў, мяккасць крокаў. І наогул каратэ нібы танец. Спарынг на татамі можна параўнаць з вальсам на паркеце.

— Цікавы погляд. А ці даводзілася табе прымяняць баявыя ўменні не на спаборніцтвах, а, так бы мовіць, у жыцці?

— Было такое. Але далей кідка праз плячо не дайшло. Кёкусенкай вучыць, як пазбягаць вострых канфліктаў, тэхнікі прымяняюцца толькі для абароны. Лепшы бой той, які скончыўся не пачаўшыся.

— Арцём, якія цудоўныя ў цябе вучаніцы. Нават самой захацелася далучыцца да вашых трэніровак.

— Прыходзь, калі ласка. Будзем рады. Дарэчы, Даша зусім нядаўна здала іспыты на другі кю і цяпер мае карычневы пояс. Гэта паказчык вялікага майстэрства.

— Арцём, і апошняе пытанне. Ці ганарышся ты сваімі вучнямі?

— Так! Асабліва іх поспехамі на спаборніцтвах.

Таццяна ПРУС.

Тусоўка

У МІНСКУ ЗГУЛЯЛІ ВЯСЕЛЛЕ ГАНГСТАРЫ

Перастрэлкі і арышты, «сухі закон» і атмасфера кабарэ, пах дарагіх цыгарак і фішкі казіно... І ўсё гэта — не парушаючы дзейнага заканадаўства Беларусі! У адным з начных клубаў сталіцы адбылася незвычайная вясельная вечарынка ў рэтра-стылі. Усім яе ўдзельнікам давялося павандраваць у часе і прасторы — перанесціся ў Чыкага 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Арганізатарамі гэтай вечарынкі выступіў святочны інфармацыйны цэнтр Prazdnik.by. Прычым рэтра-вяселле было не бутафорыяй, а рэпетыцыяй сапраўднага вяселля, якое неўзабаве згуляе маладая пара — Аляксей Конік і Вольга Лапцёнак. Само ж свята — гэта ўжо трэцяя па ліку «серыя» рэаліці-праекта «Антыкрызіснае вяселле», мэта якога — нагадаць цяперашнім і будучым жаніхам і нявестам, што ўласнае вяселле можна зрабіць небанальным, арыгінальным і дакладна запамінальным на ўсё жыццё, нягледзячы ні на якія фінансавыя цяжкасці.

На «вяселлі ў чыкагскім стылі», напрыклад, госці прыходзілі ў захапленне не толькі ад стылізаваных убораў, афармлення залы і забаўляльнай праграмы, але таксама ад кабрыялета... які можна было з'есці!

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НЕБЯСПЕЧНА ДЛЯ ЗДАРОЎЯ

У Мінску затрыманы гандляры спайсам

Чацвярых маладых людзей, якія займаліся незаконнай рэалізацыяй курыльнай сумесі тыпу спайс, праваахоўнікі з доказамі віны ўзялі ў сераду.

Як паведамілі карэспандэнту "Звязды" ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС, на рынку Беларусі, у тым ліку сталіцы, гэтая травяная курыльная сумесь пачала распаўсюджвацца з канца леташняга года. Дзялкі, якія робяць на гэтым грошы, прапагандуюць спайс як бясшкодны від тытунёвых вырабаў супакаяльнага і антыстрэсавага ўздзеяння. Прычым, яны акцэнтуюць увагу на тым, што сама сумесь вырабляецца па нейкіх тайных і старажытных рэцэптах, а інгрэдыенты, што ўваходзяць у яго склад, маюць выключна натуральнае паходжанне.

Разам з тым, цяпер ужо дакладна вядома, што згаданыя курыльныя сумесі ўтрымліваюць ў сваім складзе сумесі амідаў тлустых кіслот, у тым ліку сінтэтычных канабіноідаў, дзеянне якіх на арганізм чалавека падобны на эфект, што выклікаецца спажываннем каноплі (марыхуаны). А выхад са стану ап'янення ў гэтым выпадку суправаджаецца больш балючымі адчуваннямі, чым пры спажыванні наркатычных рэчываў. Паводле меркавання вучоных Інстытута судовай медыцыны Германіі, курэнне згаданых сумесяў прыводзіць да паражэння асноўных функцый галаўнога мозгу, спрыяе з'яўленню і развіццю ракавых захворванняў, а таксама псіхічнай паталогіі.

Што ж датычыцца затрыманага "квартэту", то высветлілася, што яны не ў першыню займаюцца незаконнай дзейнасцю, а таму разглядаецца пытанне аб прыцягненні іх да крымінальнай адказнасці. Паводле тлумачэнняў аднаго з затрыманых, спайс набываўся і ўвозіўся з Расіі, а ў беларускай сталіцы рэалізоўваўся па цане 60-70 тысяч рублёў за грам.

Ігар ГРЫШЫН.

7 жніўня

Дзве даты

1757 год — на Слуцкую мануфактуру шаўковых паясоў (Слуцкая персіярня заснавана ў 1736 годзе) з горада Станіслава (Івана-Франкоўск) быў запрошаны майстар Ян Маджарскі. Менавіта ён распрацаваў новы тып пояса — слуцкі. Спачатку на ёй (як і на іншых мануфактурах-персіярнях) толькі капіравалі ўзоры паясоў, прывезеных з Блізкага Усходу. Пад кіраўніцтвам Маджарскага беларускія майстры ручнога шаўковага ткацтва надалі паясам характэрны мясцовы выгляд, уключыўшы ў арнамент нацыянальныя матывы, кветкі мясцовай флоры — васількі, незабудкі. Склаўся тып пояса — слуцкі, назва якога стала сінонімам усіх доўгіх шаўковых паясоў.

1948 год — завяршыла работу сесія Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна (УАСГНІЛ), якая прызнала вучэнне «народнага акадэміка» Т. Лысенкі адзіна правільным. У СССР разгарнулася кампанія супраць генетыкі і кібернетыкі, што абярнулася непапраўнымі стратамі для навуковага патэнцыялу краіны.

Цытата дня

«Калі адно-два прыветлівыя словы могуць зрабіць чалавека шчаслівым, трэба быць нягодні-кам, каб адмовіць яму ў гэтым».
Томас Пейн (1737--1809), удзельнік вайны за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы.

МАНЕТЫ

Свет і сусвет

Манеты (медныя, залатыя, срэбныя) у культуры шматлікіх народаў свету заўсёды сімвалізавалі дабрабыт, прыбытак, поспех. З гэтай нагоды іх даволі паспяхова выкарыстоўвалі ў абрадах сямейна-родавай накіраванасці:

- Так, падчас правядзення абраду першага рытуальнага купання дзіцяці ў купель клалі срэбную ці залатую манеты, каб малое было заўсёды здаровае і яму спрыяў поспех.
- Для таго ж маладым падчас вянчання ў храме раілі пакласці пад правую пяту манету — медныя пятакі.
- Дрэннай прыкметай на пахаванні было тое, калі памерлы адкрываў вочы. Лічылася, што ён «выглядае» яшчэ кагосьці. У такіх выпадках на яго вочы клалі манеты, якія потым трэба было абавязкова кінуць у магілу.
- Абавязковай часткай пахавальнага абраду ў нашых продкаў было развітанне з памерлым. Родныя першай, другой і трэцяй ступені сваяцтва павінны былі кідаць у магілу грошы — манеты. Тым самым яны «выкупалі» пераправу сваяку на той свет.
- Знойдзеная манета прадказвала будучыню: змены, павелічэнне дастатку — калі ляжала «арлом» уверх, няўдачы — калі ляжала «рэшкай» уверх.
- Калі сярод іншых манет траплялася манета са шчарбінай, гнутая манета, то гэта заўсёды прадказвала прыбытак. Таму яе адкладалі ўбок ці насілі ў кашальку як талісман, сімвал поспеху. Тое ж самае датычылася манеты з дзірачкай.
- Каб заўсёды быць з прыбыткам, неабходна грошы-манеты «паказаць» маладому Месяцу, які вы ўбачылі справа ад сябе.
- Для таго ж трэба было патрэсці манетамі ў кішэні, калі вясной упершыню пачуеце зязюлю.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Мужчына лічыцца сталым, калі перастае вылучацца сярод цяжарных жанчын.

☺

Тоўстага мужыка прысудзілі да смерці на электрычным крэсле, а ён у яго не ўлазіць. Пасадзілі на дыету — паправіўся на 10 кілаграмаў. Сталі даваць толькі хлеб і ваду — яшчэ 10 кілаграмаў дадаў. Пакінулі адну ваду — яшчэ плюс 10 кілаграмаў. Не вытрымалі:

— Ды што ж ты гад, ніяк не худнееш?

— Матывацыі, разумееце, няма...

☺

Папялушкі знікаюць апоўначы, а прынцы — на досвітку.

☺

— Уяві, дарагая, мы дзесяць гадоў разам — і ні адной сваркі!

— Ведаю, баязлівец няшчасны!

☺

— Ад гэтых жанчын можна чакаць усё, што заўгодна... Вы ведаеце, што мая ўчора выкінула?!
— Што?
— Шафу!

ВАЕНПРАЕКТ:

І Ў ЧАС КРЫЗІСУ МЫ ПРЫРАСТАЕМ ЗАКАЗАМІ

Пазнавальны мінчанамі «Дом пад шпілем» па вул. Камуністычнай — візітная картка «Ваенпраекта».

ВЫТОКІ

Гісторыя ваеннага праектавання Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь непарыўна звязана з гісторыяй фарміравання Беларускай арміі, асновай для якой паслужыла Беларуская ваенная акруга.

...Загадам Калегіі народных камісараў па ваенных і марскіх справах ад 16 чэрвеня 1918 года № 544 быў сфарміраваны штат акружнога кватэрнага ўпраўлення, які знаходзіўся ў Смаленску. У яго складзе было адасоблена будаўнічае аддзяленне, чыёй задачай апроч іншага з'яўляліся «распрацоўкі праектаў і каштарысаў па капітальных перабудовах і новых збудаваннях». У азначаванне фарміравання 16 чэрвеня 1918 года першага праектнага падраздзялення міністр абароны Беларусі вызначыў сваім загадам згаданую дату ў якасці свята прадпрыемства, якое адзначаецца кожны год.

Канчаткова праектнае падраздзяленне ў складзе акружнога кватэрнага ўпраўлення сфарміравалася ў лютым 1919-га.

Сфера ўплыву ваенных праекціроўшчыкаў і будаўнікоў Заходняй ваеннай акругі распаўсюджвалася на пяць губерняў: Смаленскую, Віцебскую, Магілёўскую, Мінскую і Віленскую.

Першым начальнікам акружнога кватэрнага ўпраўлення Заходняй ваеннай акругі, які кіраваў арганізацыяй праектных работ па будаўнічых аб'ектах для патрэб акругі і стварэннем групы праекціроўшчыкаў (асновы будучага «Ваенпраекта») быў ваенны інжынер Цімафей Янчыс, палкоўнік расійскай імператарскай арміі, кавалер чатырох ордэнаў. З верасня 1919 года ўпраўленне ўзначаліў ваенны інжынер І. Веверн, таксама палкоўнік расійскай імператарскай арміі. Ён працягнуў работу Янчыса.

На працягу 1919—1920 гадоў праекціроўшчыкамі былі выкананы наступныя работы: прыстасаванне будынкаў пад размяшчэнне падраздзяленняў Чырвонай Арміі, а таксама пад акружныя склады; распрацоўка праектнай дакументацыі на змяненне кірунку Рыга-Арлоўскай чыгункі; капітальны рамонт казармаў у Смаленску, Гомелі, Рагачове, Сянно, Чавусах, Полацку і інш.

У перыяд з 1920 па 1929 год сярод найбольш значных аб'ектаў былі работы па: капітальным рамонце 731-га і 222-га ваенных шпіталяў; абуладкаванні гарадкоў Каравульнага батальёна, будынка Губваенкамата і гасцініцы «Брыстоль» у Гомелі; распрацоўцы дакументацыі на рэканструкцыю часткі Быхаўскага замка і на рамонт Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку.

У прамежак часу з 1930 па 1941 год

Начальнік РУП «Упраўленне ваеннага праектавання» Сяргей Сцяпанавіч КАРПАЎ.

Военпроект

У нашай краіне шмат арганізацый, якія займаюцца праектнымі работамі. Усе яны, як правіла, маюць больш-менш вузкую спецыялізацыю: адны скіраваны на жылую забудову, іншыя — выключна на прамысловыя аб'екты. У гэтым сэнсе РУП «Упраўленне ваеннага праектавання», больш вядомае пад сваёй гістарычнай назвай «Ваенпраект» — унікальнае прадпрыемства. Мала знойдзецца праектных інстытутаў з такой багатай гісторыяй і разнастайнасцю задач, якія яму давялося выконваць. На рахунку спецыялістаў «Ваенпраекта» не толькі аб'екты спецыяльнага і двайнога прызначэння для патрэб Мінабароны, Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў, Міністэрства ўнутраных спраў, але і горадабудаўнічыя рашэнні, жыллё, аб'екты спорту, культуры, медыцыны, адукацыі, прамысловасці.

Мемарыяльны комплекс «Вострaў слёз».

У 1960—1969 гады ішло будаўніцтва стартавых пазіцый ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння; праектаванне ціра імя Маршала Цімашэнкі; праектаванне дамоў афіцэраў у Гродне, Смаленску, Баранавічах, ваенным гарадку Уручча і г.д.

За прамежак часу з 1970-га па 1979-ы была праведзена распрацоўка праектнай дакументацыі на будаўніцтва шэрагу жылых дамоў у розных гарадах БССР; праектаванне 214-га камбіната жалезабетонных вырабаў і цэха 124-га аўтамабільнага рамонтнага завода ў Мінску; праектаванне вучэбнага корпуса Мінскага вышэйшага інжынернага зенітна-ракетнага вучылішча.

1980—1989 гады: ішло праектаванне аб'ектаў абарончай гаспадаркі, будынкаў і збудаванняў для Паўночнай групы войскаў на тэрыторыі Польскай Народнай Рэспублікі; праектаванне закрытых спецаб'ектаў у Соснах і Шчыткавічах, станцый ліквідавання ракет сярэдняй дальнасці

«Ваенпраектам» створаны будынак Штаба БВА (зараз гэта будынак Міністэрства аховы Рэспублікі Беларусь). Аўтар — заслужаны архітэктар БССР, галоўны архітэктар «Ваенпраекта» з 1945 па 1953 г., маёр В.І. ГУСЕЎ.



Біятлонны палігон «Заечая паляна» ў Лагойскім раёне.

ў Станькаве і Лясным; праектаванне ракетна-тэхнічных пазіцый на тэрыторыі БССР і закрытых аб'ектаў у Прыбалтыйскай ваеннай акрузе.

Першапачаткова «Ваенпраект» быў у асноўным скіраваны на выкананне ваенных заказаў, аднак з надыходам рынкавых адносінаў, перабудовы, палітра яго заказаў значна пашырылася.

НАШЫ ДНІ

З 2000 года прадпрыемства было рэарганізавана ў РУП «Упраўленне ваеннага праектавання». Нягледзячы на складаныя часы перабудовы прадпрыемства не толькі здолела захаваць усе свае ліцэнзіі на выкананне праектных работ, але і пашырыла пералік відаў дзейнасці. Апроч непасрэдна праектавання спецыялісты «Ваенпраекта» выконваюць дэталёвае даследаванне будынкаў, праводзяць тэхнічны нагляд на будаўнічых аб'ектах.

Прадпрыемства мае сваё прадстаўніцтва ў Санкт-Пецярбургу і ліцэнзію на выкананне праектных работ на тэрыторыі Расіі.

З 2007 года на прадпрыемстве дзейнічае сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ISO 9001-2001, сертыфікаваная ў Асацыяцыі па сертыфікацыі «Русский регистр», у Сістэме добраахвотнай сертыфікацыі Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «Военный регистр» і ў Міжнароднай сетцы сертыфікацыі IQNet.

Пра выкананыя ў апошнія гады работы расказаў **галоўны інжынер «Ваенпраекта» Юрый ШЫШОЎ.**

Паводле яго слоў, на працягу апошняга дзесяцігоддзя прадпрыемства вядзе праектаванне па заказах Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў, Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і ўладаў горада Мінска.

Сярод асноўных праектаў гэтага перыяду Юрый Іванавіч назваў наступныя:

— аб'екты Дзяржаўнай праграмы захоўвання і размяшчэння боепрыпасаў;

— вучэбныя аб'екты — будынак ваеннага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, будынак Гродзенскага тэрытарыяльнага цэнтра падрыхтоўкі вайскоўцаў, рэзервістаў, маладшых камандзіраў і афіцэраў запасу, будынак Мінскага тэхнікума прадпрымальніцтва;

— шэраг аб'ектаў па выкананні Праграмы рэалізацыі канцэпцыі аховы Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь на прыбалтыйскім і ўкраінскім кірунках на 2003-2007 гады, куды былі ўключаны комплексы мабільных пагранічных застаў, штабныя і спецыяльныя будынкі, жыллё для вайскоўцаў Дзяржаўнага камітэта пагранічных войскаў і інш;

— горадабудаўнічыя аб'екты — праект дэталёвага плана тэрыторыі жылой забудовы мікрараёна Вялікі Лес у Мінску, праект дэталёвага плана забудовы тэрыторыі 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Міністэрства абароны; праект дэталёвага плана тэрыторыі ваеннага гарадка Сосны;

Жылы дом па вуліцы 50 гадоў Перамогі ў мікрараёне Уручча ў Мінску.

— спецыяльныя і агульнавайсковыя аб'екты ў інтарэсах Галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

— службовыя жылыя дамы вайскоўцаў і дамы ЖБК;

— 1-я і 2-я чэргі біятлоннага палігона «Заечая паляна» ў Лагойскім раёне.

Па заданні Урада спецыялісты «Ваенпраекта» выконвалі перадпраектныя работы на тэрыторыі іншых краін, у тым ліку і Рэспублікі Венесуэла.

— У нашага інстытута большасць праектаў — цікавыя. А часам і проста ўнікальныя, — расказвае **галоўны архітэктар праектаў Юрый ЯЗЫЛЕЦ.** — Напрыклад, рэканструкцыя стралковага ціра імя Маршала Цімашэнкі пад нацыянальны цэнтр стралковых відаў спорту. Мы прывялі яго да міжнародных нарматываў. Гэта ўнікальны аб'ект, аналагаў якому ў межах рэспублікі не існуе. Варта ўзгадаць яшчэ рэканструкцыю кіна-канцэртнай часткі Цэнтральнага Дома афіцэраў пад размяшчэнне Драматычнага тэатра Беларускай арміі і рэканструкцыю будынка штаба тылу Міністэрства абароны пад Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. Зараз завяршаем праект гадавальніка службовай сабакагадоўлі ў Мінску. Як бачыце, у нас адзін аб'ект не падобны на іншы. Самае галоўнае — адсочваць перадавыя тэхналогіі, якія сёння існуюць у будаўніцтве (і ў нашай краіне, і за межамі) і імкнуцца іх прымяняць на практыцы.

— Асабіста мне ў апошнія гады давялося займацца аб'ектамі жыллёвага будаўніцтва, — дапоўніў калегу **галоўны архітэктар праектаў Аляксей КАВАЛЁЎ.** — Узгадаю для прыкладу даволі спецыфічны аб'ект — шматпавярховы жылы дом з пакватэрным ацяпленнем у пасёлку Усходні горада Мінска. Цікавы аб'ект. Асаблівасць яго ў тым, што ў новым мікрараёне пакуль адсутнічаюць крыніцы цеплазабеспячэння, што і абумовіла неабходнасць у пакватэрным ацяпленні. На кожнай кухні ўстанаўліваецца газавы кацёл, які і награвае ваду, а да дому падводзіцца толькі газ.

...Высокая якасць работ і прафесіяналізм работнікаў «Ваенпраекта» адзначаны шматлікімі ўзнагародамі і граматамі (Савета Міністраў, Саюза будаўнікоў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, прафсаюза працоўных Узброеных Сілаў, пагранічных войскаў і МНС і інш.). З 2005-а па 2008-ы інстытут штогод прызнаваўся пераможцам у конкурсе на лепшае дасягненне ў будаўнічай галіне Беларусі ў намінацыі «Прадпрыемства года». На міжнародным конкурсе маладых архітэктараў «Леанарда-2005», дзе было прадэманстравана звыш 400 праектаў, работа супрацоўнікаў «Ваенпраекта» атрымала Гран-пры.

— Сёння можна гаварыць аб парытэце «грамадзянскіх» аб'ектаў і заказаў з боку сілавых ведамстваў, — патлумачыў сітуацыю **намеснік начальніка па маркетынгу і кіраванні якасцю Сяргей ПАЎЛЕНКА.** — Першапачаткова наш інстытут займаўся толькі ваеннымі аб'ектамі і аб'ектамі двайнога прызначэння. Апошнім часам мы выконваем вялікія аб'ёмы заказаў, не звязаных з інтарэсамі сілавых структур і абароназдольнасцю нашай дзяржавы. Гэта праекты дэталёвага планавання, забудовы новых мікрараёнаў, напрыклад, мікрараёна Вялікі Лес (былы ваенны гарадок «Уручча» ў Мінску). І ўсё ж прыярытэт у нашай рабоце застаецца за ваеннымі і спецыяльнымі аб'ектамі.

Пытанне з пошукам заказаў і барацьбы з канкурэнтамі перад намі сёння не стаіць. Ва ўмовах крызісу арганізацыі, якія выкарыстоўваюць пры праектаванні і будаўніцтве грошы дзяржаўнага бюджэту, з-за розных прычын пачалі аддаваць перавагу менавіта дзяржаўным праектным арганізацыям. Адпаведна на нас нагрузка павялічылася. Яна і была немалая, а сёлета ўвогуле наш партфель заказаў удвая перавысіў гадавы план, які мы рэальна ў стане выканаць. Аднак на прадпрыемстве робіцца ўсё магчымае, каб у самыя кароткія тэрміны выдаць заказчыку праектную дакументацыю. У практыку работы ўводзіцца паралельнае праектаванне і будаўніцтва найбольш важных і адказных будынкаў і збудаванняў, што дазваляе значна скараціць агульныя тэрміны — ад першапачатковых задум заказчыка да здачы гатовага аб'екта ў эксплуатацыю.

Сышлі ў нябыт чарцёжныя шыльды, кульманы. Сёння праекты ствараюцца з дапамогай сучаснай аргтэхнікі, з выкарыстаннем прыкладных разліковых і графічных праграм. З улікам гэтага пытанне пастаяннага абнаўлення камп'ютарнай тэхнікі і прымяняемага праграмнага забеспячэння заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі адміністрацыі.

Мы актыўна прыцягваем да работ па асобных спецыяльных раздзелах праектаў і субпадрадныя арганізацыі. Аднак паколькі адказнасць у цэлым за заказ нясём мы, то намагаемся браць толькі надзейных субпадрадчыкаў. Ва ўмовах крызісу ненадзейныя фірмы губляюць кліентаў, а мы — праваная часам установа — прырастаем заказамі.

...Прадпрыемства мае свой лагатып. «Мы не прыдумлялі яго самі, а знайшлі ў архіве на старых пасляваенных дакументах, — расказвае Сяргей Паўленка. — Аўтар невядомы. Каб аднавіць свой лагатып, мы звярнуліся ў Геральдычны Савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і атрымалі яго ў якасці геральдычнага сімвала арганізацыі. Адзначу, што звычайна геральдычныя сімвалы не прысвойваюцца асобным прадпрыемствам. Мы — адны з нямногіх, хто атрымаў не проста лагатып, а геральдычны сімвал. Каб распаўсюдзіць гэты сімвал на ўсю нашу прадукцыю, мы зарэгістравалі ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці Рэспублікі Беларусь свой таварны знак, які ўключае наш геральдычны сімвал і назву «Ваенпраект». Цяпер таварны знак мы выкарыстоўваем на ўсёй сваёй прадукцыі».

КАДРЫ

Ліхія 90-я «вымылі» з усіх праектных інстытутаў так званы «сярэдні ўзрост». Скажаўся агульны ўпадак у эканоміцы: будаўніцтва ў той час вялося маруднымі тэмпамі, заработная плата праекціроўшчыкаў і архітэктараў не адпавядала іх інтэлектуальным затратам, таму многія сышлі з прафесіі, а вярнуцца назад ўжо не змаглі.

— Тэхнічная нарматыўная дакументацыя цяпер пастаянна ўдасканальваецца, — кажа **начальнік РУП «Упраўленне ваеннага праектавання» Сяргей Сцяпанавіч КАРПАЎ**. — Кожны дзень з'яўляюцца новыя матэрыялы, новае абсталяванне, тэхналогіі, прад'яўляюцца новыя патрабаванні да будаўніцтва, і праекціроўшчык, які 5 гадоў не працаваў па спецыяльнасці, вымушаны потым асвойваць усё амаль што з нуля. У нашай прафесіі трэба быць заўсёды, трэба яе любіць, каб у цяжкую хвіліну не сысці. У «Ваенпраекце» сёння шмат моладзі і людзей ва ўзросце, а «сярэдняе звяно» малаколькаснае, мы адчуваем пэўны дэфіцыт у кіраўніках сярэдняга ўзроўню і ў моцных спецыялістах.

Прыкладна трэць усяго нашага калектыву складаюць маладыя кадры. Апошнім часам мы вельмі актыўна пачалі браць на працу маладых спецыялістаў — толькі сёлета ўзялі восем чалавек (у асноўным з архітэктурнага, будаўнічага факультэтаў і факультэта энергетычнага будаўніцтва БНТУ). Увогуле нашы ВНУ даюць выдатную тэарэтычную падрыхтоўку сваім выпускнікам. Аднак для таго, каб чалавек пачаў у праектнай справе дзейнічаць самастойна, патрэбна, каб прайшло гадоў 5. Інжынерная справа — рэч складаная, аб'екты трапляюцца самыя розныя, далёка не заўсёды атрымаецца правесці аналогію. Кожны аб'ект — гэта адкрыццё — па тэхналогіях, па сваім функцыянальным прызначэнні. Першыя 3 гады ў маладога спецыяліста ідзе перыяд станаўлення і толькі гадоў праз 5 мы можам сказаць — атрымаўся з яго праекціроўшчык, ці не.

У абавязковым парадку мы адпраўляем людзей на курсы павышэння кваліфікацыі (галоўных інжынераў праектаў, галоўных архітэктараў праектаў, галоўных спецыялістаў па раздзелах праектаў і інш.). Акрамя таго, згодна з патрабаваннямі Урада, мы штогод складаем планы павышэння кваліфікацыі, куды ўключаем усіх сваіх спецыялістаў, што дазваляе ім з часам прасунуцца вышэй па службовай лесвіцы. Перыядычна адпраўляем работнікаў (у асноўным архітэктараў) за мяжу, на выставы, семінары, каб атрымаць «баковы» вопыт, прыцягнуць навацыі заходняй архітэктуры ў сваю работу.

Паводле слоў Сяргея Сцяпанавіча, у супрацоўнікаў «Ваенпраекта» выдатна развітае пачуццё асабістай адказнасці: калі нехта з іх адстае ад плана і ведае, што падвядзе астатніх, затармозіць здачу праекта, ён выйдзе звышурочна, але зробіць усё ў тэрмін. З-за вялікага аб'ёму заказаў работнікі «Ваенпраекта» пастаянна перагружаныя. Праектная работа неспецыялісту падаецца вельмі лёгкай. Насамрэч чым больш складаны аб'ект, тым больш працаёмістым будзе яго праектаванне.

КАЛЕКТЫЎ

У «Ваенпраекта» адзін з самых моцных сацыяльных пакетаў сярод астатніх арганізацый сталіцы. Для работнікаў прадугледжаны шэраг даплат і надбавак, магчымасць пабудаваць сваё жыллё ў складзе ЖБК. З гэтай прычыны цякучасць кадраў на прадпрыемстве выключна нізкая, нягледзячы на значную загружанасць кожнага работніка.

Калектыў «Ваенпраекта» славіцца сваім сяброўствам і з'яднанасцю. Паказальным стала святкаванне 90-годдзя інстытута, якое прайшло крыху больш за год таму. «Юбілей мы ладзілі ў вялікай зале Дома афіцэраў, — дзеліцца ўспамінамі Сяргей Сцяпанавіч. — Запрасілі ўсіх былых работнікаў «Ваенпраекта». Сабралася вельмі шмат людзей. Яны прыйшлі з адкрытымі душамі і сэрцамі, бо ў іх не засталося цяжкага асадку ад работы ў нашым калектыве. Я лічу, што гэта паказальны факт. Сёння ў калектыве захоўваецца выдатны псіхалагічны клімат, эксцэсаў, якія давялося б разбіраць пры дапамозе прафсаюза і адміністрацыі, не ўзнікае. Камісія па працоўных спрэчках бяздзейнічае. Гэта таксама паказальна. Акрамя таго, у нас ужо працяглы тэрмін няма звальненняў па негатыўных артыкулах, няма сур'ёзных парушэнняў працоўнай дысцыпліны. У нашым калектыве існуюць свае традыцыі, напрыклад, сумесная сустрэча Новага года і сумесная паездка на Дзень будаўніка. Калі першае мерапрыемства — гэта проста навагодняе свята, то Дзень будаўніка — гэта ў першую чаргу экскурсія. Прафсаюз і адміністрацыя заўсёды імкнуцца ўвязаць паездку з тэмай архітэктуры і будаўніцтва. За апошнія гады мы пабылі на «Лініі Сталіна» (для нас яна цікавая як узор фарцыфікацыйнага будаўніцтва), у музеі беларускай архітэктуры і быту пад Мінскам, у Дудутках, у Лідскім замку. Сёлета плануем наведаць Нацыянальную бібліятэку, аціць яе інжынерныя

Адміністрацыя і калектыў «Ваенпраекта» не пакідаюць сваіх ветэранаў без увагі і дапамогі.

Урачыстае святкаванне 90-годдзя прадпрыемства.

— расказвае **спецыяліст па ахове працы, старшыня пярвічнай групы ветэранаў «Ваенпраекта» Грамадскага аб'яднання ветэранаў вайны і ваеннага будаўніцтва Валянціна Пятроўна ЛАДУЦЬКА.** — Мы рэгулярна праводзім сходы членаў нашай групы, абавязкова віншуем ветэранаў з Новым годам, з Днём Узброеных Сілаў, з 8 Сакавіка і Днём будаўніка. Для людзей сталых, непрацуючых такая ўвага мае вялікае значэнне. Ім важна ведаць, што пра іх не забыліся, што іх памятаюць. Працуем у цесным кантакце з прафсаюзам. Вялікую падтрымку ва ўсіх нашых пачынаннях аказвае наша кіраўніцтва.

— Шмат увагі мы надаём культмасавай і спартыўнай рабоце, — развівае тэму **старшыня прафсаюзнага камітэта № 9 Беларускага прафесійнага саюза работнікаў Узброеных Сілаў, пагранічных войскаў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Вера Уладзіміраўна НОВІКАВА,** якая працуе на прадпрыемстве з 1977 года. — Праводзім футбольныя турніры, выязджаем на пікнікі. Многія супрацоўнікі нашай арганізацыі наведваюць трэнажорныя залы, басейны, якія аплачвае прафкам.

Самым грандыёзным мерапрыемствам, ад якога яшчэ захавалася свежасць уражанняў, для жанчын стала леташняе святкаванне 90-годдзя роднага інстытута. Асабліва запомніліся сустрэчы былых супрацоўнікаў, якія на юбілей атрымалі магчымасць пакантактаваць са старымі сябрамі і калегамі. «Людзі былі ўражаны, расчулены. Яны так шчыра радаваліся, абдымаліся, цалаваліся, — узгадвае Вера Уладзіміраўна. — Усё было вельмі шчыра і ад душы».

— Наш калектыў абнаўляецца за кошт маладых спецыялістаў, — працягвае гутарку Валянціна Пятроўна. — Усе яны адукаваныя, але ім заўсёды ёсць чаму павучыцца ў кагорты нашых спрактыкаваных сталых работнікаў. Моладзь у нас добразычлівая, не закамплексаваная, багатая на творчыя ідэі і задумы. Асобна трэба расказаць пра святкаванне 23 лютага і 8 Сакавіка, дзе маладыя супрацоўнікі могуць праяўляюць свае творчыя здольнасці. Яны штогод ладзяць яскравыя тэатральныя паказы. Сёлета, напрыклад, паказы прайшлі ў форме спектакля-казкі пра мужчын «Ваенпраекта» і ў форме ўрачыстага ўзнагароджання прэміяй «Оскар» жаночай часткі калектыву ў розных намінацыях.

Моладзь актыўна дапамагае і ў арганізацыі шматлікіх выстаў творчых работ нашых супрацоўнікаў і ветэранаў, дзе дэманструюцца ручныя вырабы, фота, малюнкі. Узгадаю «Дары восені», «Ваенпраект» без гальштука» і г.д. Такія выставы дапамагаюць з'яднаць старэйшае і малодшае пакаленні калектыву.

— Са свайго боку адміністрацыя робіць усё магчымае, каб стварыць выдатныя ўмовы працы для работнікаў прадпрыемства, — паведаміў **начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і прапускнога рэжыму Валерый ЯКАЎЛЕЎ.** — За апошнія 2 гады праведзены рамонт ва ўсіх праектных кабінетах. У стадыі рамонту і аптымізацыі знаходзяцца памяшканні архіва тэхнічнай дакументацыі. Усе кабінеты ўкамплектаваныя сучаснай зручнай мэбляй. Вельмі шмат зроблена для забеспячэння работнікаў прадпрыемства неабходным абсталяваннем, прыборамі, спецвопраткай і г.д.

— Наш калектыў — гэта выдатны сплаў вопыту і маладосці, — падсумоўваў выказванні сваіх работнікаў Сяргей Сцянавіч. — Гэта калектыў, які ўстаяўся, з'яднаны, зладжаны. У нас шмат маладых спецыялістаў, шмат заказаў, таму ў будучыню мы глядзім з аптымізмам.

Хацеў ба падкрэсліць, што вынік працы праекціроўшчыкаў залежыць не толькі ад зладжанай работы калектыву прадпрыемства. Хочацца выказаць падзяку за дзейсную эфектыўную дапамогу кіраўніцтву Міністэрства абароны і асабліва людзям, якія курыруюць нашу дзейнасць, — намесніку міністра абароны па тыле — начальніку тылу Узброеных Сілаў генерал-маёру А. Балігатаву, намесніку начальніка тылу па будаўніцтве і раскватараванні войскаў палкоўніку С. Рудому.

Важнае значэнне ў стварэнні праекта мае ўзгодненасць дзеянняў і паразуменне паміж праекціроўшчыкамі і прадстаўнікамі заказчыка.

З прыемнасцю адзначу, што ў большасці выпадкаў «Ваенпраекту» выпадае гонар працаваць з па-сапраўднаму высокапрафесійнымі вопытнымі інжынерамі.

Карыстаючыся выпадкам, мы хочам павіншаваць з надыходным Днём будаўніка Галоўнае ўпраўленне будаўніцтва і эксплуатацыі Узброеных Сілаў, службы заказчыка іншых сілавых ведамстваў, упраўленні заказчыка адміністрацыйных раёнаў горада Мінска і Мінскага раёна, нашых калег з праектных і будаўнічых арганізацый — усіх, хто з гонарам носіць пачэснае званне БУДАЎНІК.

Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.

УНП 100007119.

Калектыў «Ваенпраекта» аддае перавагу актыўнаму адпачынку.

Адміністрацыйны будынак Дзяржаўнага пагранічнага камітэта ў г. Мінску.

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 ЖНІЎНЯ

5.35 Серыял «Як сказаў Джым».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 У свеце матораў.
9.10 Nota Bene.
9.35 «Здароўе».
10.00 «Іншай дарогі няма». Дак. фільм.
11.00, 17.40 Серыял «Заўсёды кажы «заўсёды».
12.10 Меладрама «Я ведаю, як стаць шчаслівым».
13.25 «Пераможцы-2009».
14.20 «Каталонскія канікулы».
14.45 «Нябачны фронт».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Даруй мне».
15.55 Серыял «Пастка». 1-я серыя.
16.45 Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
